Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 3 (6885) | 4 студзеня 1941 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

За дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

Сходы партактыва.

У ЦК ЛКСМБ.

Адкрылася VI канферэнцыя комсамола ЗахАВА.

У ДАПАМОГУ ВЫВУЧАЮЧЫМ ГІСТОРЫЮ ВКП(б). М. Вершык — **Ленінскі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва.**

АРТЫКУЛЫ:

К. Чорны — Новагодняя ноч.

Е. Чалік — Знішчальная авіяцыя.

П. Масіалёў — Будаўніцтва новых электрастанцый.

А. Ганчароў — Садова-агародная брыгада ордэнаноснага калгаса.

Е. Жукоўскі — Няма барацьбы з нарушальнікамі Статута сельгасарцелі.

А. Курловіч—Наш вопыт работы з рабселькорамі.

А. Лютарэвіч, Ф. Скоблікаў — Перамогі добрушскіх рабочых.

БІБЛІЯГРАФІЯ. **Н. Пузікаў** — «Бібліятэка стаханаўскага вопыту».

КІНО. **С. Куняўскі** — «Сібіракі».

ЗА РУБЯЖОМ:

Англа-германская вайна. Германскія паведамленні. Англійскія паведамленні.

Даклад вярхоўнага камандавання германскай армії аб ваенных дзеяннях у другой палавіне 1940 г.

Далейшыя планы аказання амерыканскай дапамогі Англіі.

Ваенныя дзеянні ў Албаніі.

Зводка італьянскага камандавання.

Падрабязнасці налёту на Брэмен.

Бамбардыроўка Салонік.

Прамова Чан Кай-шы.

СТВАРЫЦЬ ТВОРЫ ВЫСОКАЙ ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЙ ЯКАСЦІ

Наш вялікі народ і комуністычная партыя высока цэняць працу совецкіх пісьменнікаў. Таварыш Сталін назваў іх «інжынерамі чалавечых душ». Велізарнымі клопатамі і ўвагай акружаюць партыя і совецкі ўрад працу кожнага сапраўднага майстра, які стварае высока-ідэйныя мастацкія творы. Шырока папулярны ў нас тыя пісьменнікі, якія чэсна і адлана працуюць на прапвітанне самай перадавой у свеце совецкай літаратуры, сваімі творамі выхоўваюць у прапоўных нашай радзімы дух совецкага патрыятызма, любоў да комуністычнай партыі, адданасць справе соцыялізма.

За гады совецкай улады ўзмужала і ўмацавалася беларуская совецкая літаратура, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна яна, як і ўсе брацкія літаратуры СССР, вышла на шырокую дарогу сапраўднага творчага росквіту. Беларускі народ ведае і горача любіць сваіх пісьменнікаў, якія напісалі нямала выдатных твораў, актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве соцыялізма.

Прайшоўшы 1940 год быў, як і мінулыя годы, вельмі багатым і плодатворным. Напісана нямала новых твораў. Дастаткова назваць зборнікі вершаў «Ад сэрца»—Янкі Купалы, «Пад сталінскім сонцам»—Якуба Коласа, зборнік выбраных вершаў Максіма Танка, «Шляхамі баравымі»—Пятруся Броўкі, п'есу «Пад Бярозай-ракой»—Пятра Глебкі, зборнік апавяданняў «Сустрэчы»—Міхася Лынькова, першую кнігу рамана «Паўстанне»—М. Пасляловіча, новыя творы Змітрака Бядулі, Кандрата Крапівы, Кузьмы Чорнага, В. Вольскага, Аркадзія Куляшова і многіх іншых.

Беларуская літаратура ўпэўнена ідзе па шляху свайго мастацкага ўдасканалення, узбагачэння новымі тэмамі, выхавання новых кадраў совецкіх літаратараў.

За невялікі адрэзак часу жыцця прапоўных захоўніх абласцей Беларусі пад сталінскім сонцам краіны Советаў расквітнелі велізарныя таленты з петраў раней прыгнечанага народа. У заходніх абласцях рэспублікі паспяхова працуе група таленавітых беларускіх пісьменнікаў. Акрыленыя ўвагай партыі і ўрада, актыўна ўключыліся ў творчую работу польскія і яўрэйскія паэты і пісьменнікі. Усім ім комуністычная партыя і совецкі ўрад дапамагаюць развіваць свае здольнасці, вучыцца і ствараць каштоўнае ў літаратуры. Ужо многія з пісьменнікаў заходніх абласцей (Танк, Пестрак, Бранеўская, Машара і інш.) выдалі і падрыхтавалі да друку свае кнігі, актыўна супрацоўнічаюць у перыядычным друку, прымаюць самы дзейны ўдзел у грамадска-палітычнай рабоце.

Аднак, не гледзячы на свой буйны росквіт, беларуская літаратура мае яшчэ істотныя недахопы.

Перш за ўсё яны зводзяцца да слабага адлюстравання ў творах беларускіх пісьменнікаў гераічнага мінулага нашага народа, да абмежаванасці тэматыкі і жанраў у паказе нашай цудоўнай рэчаіснасці. Ніяк нельга лічыць здавальняючай работу пісьменнікаў, пакуль яны не напішуць высокамастацкіх твораў аб Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі на Беларусі, аб гераічнай барацьбе беларускага народа з польскімі панамі, аб стварэнні беларускай дзяржавы пры актыўнай дапамозе вялікага рускага народа і пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна. Гэтыя тэмы з'яўляюцца выключна актуальнымі і важнымі. Іх выкананне патрабуе ад нашых пісьменнікаў і паэтаў вялікай, крапатлівай работы. У новым годзе задача ўсіх нашых літаратараў—напісаць творы, дастойныя гэтых адказных тэм.

Вельмі мала пішуць нашы пісьменнікі аб новым совецкім чалавеку, аб фарміраванні яго характару, аб яго пачуццях патрыятызма і любві да сваёй маперыдзімы. А гэта павінна быць рашаючым крытэрыем у ацэнцы каштоўнасці твораў, іх ідэйнага і мастацкага зместу і выхаваўчага значэння.

Якасць літаратурнай прадукцыі ў нас не заўсёды на належным узроўні. Сярод беларускіх пісьменнікаў і паэтаў ёсць і такія, творчасць якіх мастацка слабая. За апошні час ў «Звяздзе» былі надрукаваны артыкулы, у якіх паказвалася, як асобныя пісьменнікі (Клімковіч, Стаховіч і інш.), беручы важныя і актуальныя тэмы калгаснага жыцця, не падняліся да такога ўзроўню мастацкага адлюстравання, якога патрабуе ад кожнага совецкага пісьменніка наш культурна вырасшы чытач. У друк пранікалі нават асобныя, яўна пошлыя і антысовецкія творы (аб некаторых з іх «Звязда» у свой час таксама пісала).

Барацьба за высокую ідэйна-мастацкую якасць літаратуры, за пашырэнне яе тэматыкі, за мабілізацыю ўсіх сіл пісьменніцкай грамадскасці на напісанне патрэбных нашаму чытачу твораў павінна стаць у цэнтры ўвагі праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

У Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР пытанню ідэйнага і мастацкага выхавання совецкага пісьменніка, як носьбіта перадавых ідэй сучаснасці, як чалавека, які ўлалае вялікімі ведамі і сваімі творамі вучыць народ, узляляецца яшчэ недастаткова ўвагі. Толькі ў апошнія месяцы Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў пачало пікавіцца канкрэтнай творчай і выхаваўчай работай. Пры Саюзе совецкіх пісьменнікаў зараз працуе універсітэт марксізма-ленінізма, у якім вучацца амаль усе пісьменнікі. Часцей пачалі абмяркоўвацца творы пісьменнікаў і паэтаў на пасяджэннях праўлення, у творчых секцыях.

Вельмі вялікія заганы мае беларуская крытыка. Яна мала займаецца канкрэтным разглядам твораў мастацкай літаратуры. Большасць крытыкаў Беларусі зараз ударылася ў адну крайнасць—займаецца гісторыяй літаратуры і амаль не ўзляляе ўвагі сучаснай совецкай літаратуры. Вось гэтым, бадай, і можна вытлумачыць тое, што ў беларускай літаратуры пярэдка з'яўляюцца нізкамастацкія, а часам нават ідэалагічна нявытрыманыя творы, якія не падвяргаюцца своечасова вострай большэвіцкай крытыцы.

Задача заключаецца ў тым, каб літаратурная крытыка бліжэй падышла да работы пісьменнікаў, каб яна дапамагала яшчэ большаму росту і росквіту нашай літаратуры. Для гэтага крытыка павінна быць прынцыповай, смела і адкрыта гаварыць аб недахопах у творах «вядомых» і «малавядомых» пісьменнікаў. Да ацэнкі літаратурных твораў трэба падыходзіць перш за ўсё з пункту гледжання задач будаўніцтва комунізма, з пункту погляду інтарэсаў нашай радзімы. Рашаючым у ацэнцы літаратурных твораў павінна быць тое, наколькі ў іх паказана пачуццё совецкага патрыятызма, наколькі гэтыя творы выхоўваюць у совецкага чытача любоў да комуністычнай партыі, адданасць справе соцыялізма. Крытыка павінна быць у нас на ўзроўні пастаноўкі новых задач перад літаратурай. Яна павінна весці пісьменнікаў уперад, вучыць іх. Беларускім крытыкам яшчэ многа трэба працаваць над сабой для таго, каб паспяхова выканаць гэтыя адказныя задачы.

Галоўнай задачай Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі зараз павінна быць выхаванне пісьменніка—ідэйнае, мастацкае, маральнае,—цярплівая і настойлівая работа з кожным у паасобку, каб накіроўваць яго работу, практычна дапамагаць яму.

Літаратурная работа ў нашай краіне—пачотная, і нашы пісьменнікі павінны аб гэтым не забываць. На клопаты, увагу партыі і ўрада яны абавязаны адказаць стварэннем высокаідэйных і высокамастацкіх твораў.

Зараз, калі ў нашай рэспубліцы ў новым гаспадарчым годзе разгортваецца грандыёзнае будаўніцтва ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, калі праводзіцца выключна натхнёная работа на ўсіх участках, пісьменнікі БССР павінны ісці ў першых радах, адлюстроўваць у сваіх творах пафас будаўніцтва, паказваць перадавых людзей. Беларускі народ мае права патрабаваць і чакаць ад сваіх сыноў—беларускіх пісьменнікаў, выхаваных і выпеставаных партыяй большэвікоў,—новых творчых дасягненняў.

1941 год павінен з'явіцца для ўсёй беларускай літаратуры годам далейшых вялікіх поспехаў, годам стварэння новых твораў, дастойных выдатнай сталінскай эпохі.

Адкрылася VI канферэнцыя комсамола ЗахАВА

Учора ў Доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава пачала сваю работу VI канферэнцыя комсамола Заходняй Асобай Ваеннай Акругі.

Канферэнцыю адкрывае старшы батальённы камісар тав. Гарбушын. У кароткай уступнай прамове, не раз перарываемай апладысментамі ў чэсць вялікай большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна, ён падкрэслівае, што комсамол акругі прышоў да сваёй VI канферэнцыі адзіным, маналітным, згуртаваным вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і таварыша Сталіна.

Аднагалосна ў прэзідыум канферэнцыі выбіраюцца сакратар ЦК КП(б)Б член Ваеннага Совета ЗахАВА тав. Панамарэнка, камандуючы войскамі ЗахАВА генерал-палкоўнік танкавых войск Герой Совецкага Саюза тов. Паўлаў, сакратары ЦК КП(б)Б тт. Кулагін, Эйдзінаў, Малін, карпусны камісар тав. Фаміных, генерал-лейтэнант тав Болдзін, Героі Совецкага Саюза тт Рабыкін і Жураўлёў, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Зімянін і інш.

З вялікім уздымам удзельнікі канферэнцыі выбралі пачотны прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным і таварышоў Дзімітрава і Тімашэнка.

Пасля выбрання мандатнай камісіі, сакратарыята і рэдакцыйнай камісіі, з дакладам аб задачах комсамольскіх арганізацый Заходняй Асобай Ваеннай Акругі ў сувязі з перабудовай баявой вучобы выступіў карпусны камісар тав. Фаміных.

Дакладчык падкрэсліў, што комсамол акругі з'яўляецца сапраўдным памочнікам камандавання і партарганізацый у справе выканання задач, пастаўленых Народным Камісарам Абароны. Паказваючы асабісты прыклад у вучобе і дысцыпліне, армейскія комсамольцы актыўна змагаюцца за ўсямернае ўмацаванне адзінаначалля, за насаджэнне жалезнай воінскай дысцыпліны ў часцях і падраздзяленнях і максімальнае набліжэнне ўсёй вучобы да ўмоў сучаснай баявой абстаноўкі.

Пасля даклада канферэнцыя з вялікім натхненнем паслала прывітальную тэлеграму правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Па дакладу пачаліся спрэчкі.

Сёння канферэнцыя прадаўжае сваю работу.

Нароўля, Леспрамгас

Брыгадзіру лесарубаў тав. Вайстраценка Дзмітрыю Леўкавічу

Віншую Вас, тав. Вайстраценка, і Вашу брыгаду з поспехамі, дасягнутымі на рубцы лесу.

На аснове прымянення стаханаўскіх металаў работы Ваша брыгада лесарубаў у саставе чатырох чалавек загатовіла 302 кубаметры фанернай сыравіны — 1.887 процантаў дзённай нормы. Замацаваннем у далейшых гэтых дасягненняў Вы паставіце сябе ў рады перадавікоў лясной прамысловасці.

Жадаю Вам яшчэ большых поспехаў. Прашу перадаць прывітанне ўсім лесарубам Нараўлянскага леспрамгаса і пажаданне не адставаць ад Вас у выкананні плана лесазагатовак.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.

ЗА ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ XVIII УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

ОРША. (**По тэлефону**). Усё больш прадпрыемстваў, МТС і калгасаў Аршанскага раёна ўключаюцца ў спаборніцтва на дастойную сустрэчу дня адкрыцця XVIII партыйнай канферэнцыі.

Калектыў Аршанскага IV аддзялення Заходняй чыгункі па-большэвіцку змагаецца за выкананне ўзятых абавязацельстваў. Машыніст т. Мікуловіч скарапіў манеўравую работу на ўчастку і даставіў поезд на ст. Барысаў раней раскладу на 2 гадзіны. Чотка і зладжана працуюць вузлавы дыспетчар т. Сафрановіч, дзяжурны па аддзяленню т. Вайніловіч, дзяжурныя па станцыі Орша-Усходняя тт. Каршуноў, Ляхоўскі і інш. Яны забяспечваюць адпраўленне ўсіх паездоў па раскладу.

***

Калектыў падрыхтоўча-ткацкага цэха ільнокамбіната абавязаўся выпускаць за суткі 48—49 тыс. метраў тканіны пры плане ў 45 тыс. метраў, эканоміць сыравіну, забяспечыць выкананне норм кожным рабочым.

Стаханаўкі тт. Мацулёва, Сіларовіч, Казлова, Гужава, Фокіна, Ермаловіч і Далідовіч за змену апрацоўваюць прадзіва на 80—90 кілограмаў пры норме 58,9 кілограма.

***

Калектыў рамонтнікаў Копыскай МТС, разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII партканферэнцыі, выканаў план рамонту трактараў IV квартала. Трактарыст т. Расткоў на рамонце радыятараў выконваў норму на 300 проц. і даваў высокую якасць. Сістэматычна выконваючы норму на 250 проц., трактарыст Шастакоў закончыў рамонт свайго трактара «Універсал» 28 снежня. За тры дні высокаякасна адрамантаваў трактар тав. Кулікін, ён даваў штодзённа 300 проц. нормы.

Загадчык майстэрні механік т. Красоўскі днямі прынят у кандыдаты партыі. Гэтую знамянальную падзею ў сваім жыцці ён адзначае пераводам рамонтных работ на дзве змены, арганізацыяй тэхнічнай вучобы трактарыстаў. Зараз 26 рамонтнікаў МТС (з 36 чал.) перавыконваюць норму выпрацоўкі.

План рамонту трактарнага парка калектыў МТС абавязаўся выканаць да 5 лютага.

Шырыцца спаборніцтва

ХОЙНІКІ, 2 студзеня. (БЕЛТА). З кожным днём шырыцца спаборніцтва калгасаў раёна ў чэсць XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны сцяг» падрыхтавалі добра ачышчанае насенне, адрамантавалі 30 плугоў, 29 боран, 4 сеялкі, сабралі больш 6 тон мясцовага ўгнаення. Брыгады спаборнічаюць паміж сабой за дастойную сустрэчу дня адкрыцця XVIII партыйнай канферэнцыі.

Добры падарунак рыхтуюць XVIII партканферэнцыі трактарысты Рудакоўскай МТС. У чэсць канферэнцыі яны датэрмінова выканалі план рамонту трактараў. Трактарысты тт. Каваленка, Ерольчык і Даленчук выконваюць свае нормы на 170—180 проц.

БССР перавыканала план рамонту трактараў IV квартала 1940 года

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII партыйнай канферэнцыі, машынна-трактарныя станцыі БССР значна перавыканалі план рамонту трактараў IV квартала. На 1 студзеня гэтага года з капітальнага рамонту выпушчана 1.529 трактараў пры плане 1.111, з бягучага рамонту — 2.766 пры плане 1.905.

Усяго адрамантавана 4.295 трактараў — на 2.244 больш, чым на гэты-ж тэрмін у мінулым годзе. (БЕЛТА).

Перадавікі рамонту трактараў

Змагаючыся за дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, МТС Мінскай абласці паспяхова праводзяць рамонт трактараў. На 1 студзеня выканалі поўнасцю гадавы план рамонту 11 МТС абласці. Закончылі рамонт трактараў усе МТС Чырвонаслабодскага, Старадарожскага, Рудзенскага раёнаў, Бауманская МТС, Слуцкага раёна, і Барысаўская МТС. Адрамантаваны капітальным рамонтам — 508 і бягучым — 840 трактараў.

СХОДЫ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

БАРАНАВІЧЫ. (**Кар. «Звязды»**). Днямі ў Доме партыйнай асветы адбыўся сход партыйнага актыва гор. Баранавічы. З дакладам аб выніках снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б выступіў першы сакратар Баранавіцкага абкома і гаркома КП(б)Б тав. І. П. Тур.

Дакладчык указаў, што ў 1940 годзе ў горадзе і раёнах абласці пабудован рад прадпрыемстваў і многа розных прамысловых арцелей, якія далі дзяржаве па 95 млн. рублёў прадукцыі. Арганізавана і дружна працуе калектыў абутковай фабрыкі індывідуальнага пашыву. Ён датэрмінова выканаў вытворчы план 1940 г. і ў чэсць XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі абавязаўся значна перавыкапаць студзеньскі і лютаўскі планы.

Але вынікі работы былі-б яшчэ лепшыя, калі-б гарком партыі і пярвічныя партыйныя арганізацыі сур'ёзна займаліся развіццём мясцовай прамысловасці, падзелавому ажыццяўлялі кантроль пад дзейнасцю гаспадарнікаў, умацоўвалі адзінаначалле камандзіраў вытворчасці.

Тав. Тур адзначыў, што ў выніку адсутнасці партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю швейная фабрыка і тры буйныя арцелі не выканалі гадавую вытворчую праграму. Ёсць многа фактаў выпуску недобраякаснай прадукцыі і прастою прадпрыемстваў. Гэтыя актуальныя пытанні работы прамысловасці не сталі прадметам шырокага абмеркавання на бюро гаркома партыі, у пярвічных партыйных арганізацыях і на агульных сходах рабочых.

Указанні, якія зрабіў пленум ЦК КП(б)Б Мінскаму гаркому КП(б)Б аб кіраўніцтве прамысловасцю, у поўнай меры адносяцца і да нашай абласной партыйнай арганізацыі. Рашэнні снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б трэба пакласці ў аснову нашых далейшых практычных дзеянняў і карэнным чынам палепшыць работу прамысловасці.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Першым выступае сакратар партыйнага бюро паравознага дэпо тав. Сцяпанаў. Ён расказвае, што пасля Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня значна ўмацавалася працоўная дысцыпліна, узнялася пралукцыйнасць працы і якасць выконваемых работ. Аднак партыйная арганізацыя зрабіла яшчэ вельмі мала для паляпшэння работы паравознага дэпо.

Пытаннямі работы дэпо і ўсёй станцыі гарком КП(б)Б займаецца мала. Работу станцыі ва многім тармозіць клієнтура. Так, аблпромсаюз і табаксаюз поўмесяца ўжо не выгружаюць сваіх тавараў, затрымліваюць абарот ватонаў. Гарком партыі абышоў гэтыя вострыя пытанні, не дапамог станцыі.

Выступіўшыя на сходзе тт. Баранаў, Мерзлоў, Бурыкін, Гарэлік, Фралоў, Нудэль, Сізоў, Вайханскі і інш. аднадушна адобрылі рашэнні снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б і абавязаліся пакласці іх у аснову работы партарганізацый, дастойна сустрэць XVIII партыйную канферэнцыю.

***

ЛІДА. (**Кар. «Звязды»**). Адбыўся сход актыва партыйнай арганізацыі гор. Ліды. Дакладчык — сакратар Лідскага райкома КП(б)Б тав. Асадчы расказаў удзельнікам схода аб выніках снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б. Ён падрабязна спыніўся на рабоце прамысловасці горада і развіцці жывёлагадоўлі ў калгасах.

Перадавым прадпрыемствам у горадзе з'яўляецца гумавая фабрыка «Арэлаль». Дзякуючы ўмела пастаўленай партыйна-масавай рабоце, на аснове разгортвання стаханаўскага руху фабрыка датэрмінова выканала свой вытворчы план 1940 года. Выпушчана 1 млн. 375 тыс. пар абутку, у тым ліку 165 тыс. пар скуранога і 1210 тысяч пар гумавага. У чэсць XVIII партканферэнцыі калектыў фабрыкі выпусціў прадукцыі звыш гадавога плана на 250 тыс. рублёў. 88 проц. прадукцыі зроблена з асвоенага совецкага сінтэтычнага каучука. Увесь абутак, выпушчаны фабрыкай, — першасортны.

Добра таксама працуюць лесапільны завод імені Дзержынскага, фабрыкі «Атэлье мод» і тэхнічнай гумы, 2 піваварныя заводы. Разам з тым ёсць і адстаючыя прадпрыемствы. Так, заводы сельгасмашын №№ 1 і 2 (дырэктары тт. Гінзбург і Вернікоўскі) і цвікавы завод (дырэктар тав. Парніке) не выканалі сваёй галавой вытворчай праграмы.

Пагоршылася за апошні час работа Лідскага чыгуначнага вузла. Тут сістэматычна не выконваюцца планы пагрузкі, партыйныя і гаспадарчыя кіраўнікі недастаткова змагаюцца за паскарэнне абароту паравоза, чоткае прасоўванне паездоў у зімовых умовах, ліквідацыю браку і аварый. Партыйна-масавая работа на вузле пастаўлена дрэнна.

Не займаўся пытаннем работы вузла і райком партыі.

У спрэчках па дакладу тав. Асадчага выступіла 11 чалавек. Сход гарадскога партыйнага актыва прыняў разгорнутае рашэнне, у якім намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам, па далейшаму развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах раёна.

У ЦК ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ, Наркамзем і Наркомсоўгасаў БССР вынеслі пастанову аб падрыхтоўцы ў гуртках без адрыву ад вытворчасці дзяўчат-трактарыстак.

У 1941 годзе ў БССР павінна быць абучана рабоце на трактары 5.170 дзяўчат. Для кіраўніцтва гурткамі дырэктары МТС і соўгасаў абавязаны вызваліць найбольш кваліфікаваных механікаў і брыгадзіраў. Пасля сканчэння вучобы ў гуртках, пры кожнай МТС будуць арганізаваны 10—15-дзённыя практычныя заняткі.

Сакратарам абкомаў і райкомаў ЛКСМБ, абласным і раённым зямельным аддзелам, дырэктарам МТС і соўгасаў прапанавана правесці сходы сельскай жаночай моладзі, па якіх абмеркаваць пытанне аб арганізацыі абучэння дзяўчат валжэнню трактара.

Устаноўлена аплата кіраўнікам гурткоў за кожную падрыхтаваную трактарыстку ў суме 50 рублёў. Тэрмін сканчэння вучобы ўстанаўліваецца — 15 мая 1941 года. (БЕЛТА).

Па Совецкай краіне

Збор высокасортных апельсінаў «Вашынгтон-Навель» для УСГВ 1941 г. На першым плане — аборшчыца А. І. Сошына (гор. Сухумі).

Фото В. Малышэва. (Фото ТАСС).

ЦЯПЛІЧНА-ПАРНІКОВАЯ ГАСПАДАРКА Ў БУХЦЕ ПРАВІДЗЕННЯ

ХАБАРАЎСК. У бухце Правідзення пад кіраўніцтвам агранома тав. Лопуха створана буйная цяплічна-парнікова гаспадарка. У мінулым годзе яна дала 10.500 кілограмаў рознай гародніны. З кожнага квадратнага метра цяпліцы знята па 250 агуркоў. Адсюль на самалётах гародніна дастаўляецца на мыс Шмідта, востраў Врангеля, у Уэлен і на іншыя палярныя станцыі Чукоткі. (ТАСС).

8800 СЛУХАЧОЎ УНІВЕРСІТЭТА МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА МГК ВКП(б)

МАСКВА. Ва універсітэце марксізма-ленінізма МГК ВКП(б) пачаліся лекцыі па ўсіх арганізаваных аднагадовых цыклах — гісторыі ВКП(б), філасофіі, палітэканоміі, гісторыі міжнародных адносін, гісторыі народаў СССР, усеагульнай гісторыі і літаратуры.

Слухачамі іх з'яўляецца каля 4.200 партыйных работнікаў, гаспадарнікаў, інжынераў, эканамістаў, урачоў, педагогаў, юрыстаў.

Слухачамі цыклавых лекцый і двухгадовых курсаў універсітэта з'яўляюцца зараз 8800 чалавек.

ЗВЁЗДНЫ ПРАБЕГ ЛАТВІЙСКІХ ЛЫЖНІКАЎ

РЫГА, 2 студзеня. (ТАСС). Учора ў Рыге пачаўся звёздны прабег лыжнікаў, арганізаваны комсамолам Латвіі ў чэсць прадстаячых выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У прабегу, які ахопіць усю тэрыторыю рэспублікі, удзельнічаюць 37 комсамольцаў.

Разбіўшыся на групы, яны накіраваліся па 5 маршрутах адлегласцю ад 390 да 425 кілометраў. Лыжнікі, спыняючыся ў вёсках, будуць весці агітацыйную работу сярод сялян. Прабег закончыцца 11 студзеня—напярэдадні дня выбараў.

НОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ АБ А. Я. ПАРХОМЕНКА

3 студзеня споўнілася 20 год з дня гібелі легендарнага начдзіва Александра Якаўлевіча Пархоменка. Цэнтральным архівам Чырвонай Арміі к гэтай дате сабраны каштоўныя дакументы, адлюстроўваючыя яго жыццё, слаўную рэволюцыйную дзейнасць і баявыя подвігі.

Выключную цікавасць прадстаўляюць матэрыялы, паказваючыя шлях 14-й кавалерыйскай дывізіі Першай конной арміі. У красавіку 1920 года таварыш Пархоменка быў назначан начальнікам гэтай дывізіі і на чале яе накіраваўся на фронт барацьбы з белапалякамі. Карты і схемы, загады і распараджэнні начдзіва напамінаюць аб гераічных дзеяннях дывізіі на польскім фронце.

3 студзеня 1921 года А. Я. Пархоменка загінуў. У Цэнтральным архіве Чырвонай Арміі захоўваецца неапублікаваны дакумент—арыгінал загада № 2 па 14-й кавалерыйскай дывізіі Першай конной арміі ад 5 студзеня 1921 года. У загадзе гаворыцца:

«Забітага ў баі з бандамі Махно начдзіва тав. Пархоменка выключыць са спіскаў дывізіі... З смерцю яго мы панеслі пяжкую ўтрату. Так адпомспім-жа жорстка за смерць дачасна загінуўшага ад рук бандытаў начальніка, байца і друга прыгнечаных. Выключым яго са спіскаў жывых, упясем яго ў бяссмертны спісак геройска паўшых за свабоду». (ТАСС).



Отогадовы старык, па нацыянальнасці далган, са сваёй сямёй на рацэ Пясіна (Таймырская нацыянальная акруга).

Фото-эцюд А. Пагосава. (Фото ТАСС).

У 200 КІЛОМЕТРАХ АД СУСВЕТНАГА ПОЛЮСА ХОЛАДУ

ХАБАРАЎСК. (ТАСС). Ля падножжа высокіх сопак у даліне ракі Берэлех размясціўся лепшы соўгас Калымы «Сусуман». Толькі дзвесце кілометраў адзяляюць яго ад сусветнага полюса холаду. Сярод вечнай мерзлаты раздзеланы абшырныя сенакосныя ўгоддзі, пабудаваны вялікія парнікі і цяпліцы, пасяхова вырашчваюцца памідоры, агуркі, капуста і іншыя культуры. Развіта прадуктыўная жывёлагадоўля.

У гэтым годзе тут упершыню на Калыме будзе прыменена паліўка палёў з дапамогай вадаправода. Зараз пачата пракладка магістралі даўжынёй у 5.000 метраў.

З вялікім уздымам рабочыя соўгаса ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б). Яны абавязваюцца своечасова адрамантаваць інвентар і падрыхтаваць закрыты грунт да пасадкі ранняй гародніны.

АБМЕН ПРОФСАЮЗНЫХ БІЛЕТАЎ

Другога студзеня пачаўся абмен профсаюзных білетаў, тэрмін дзеяння якіх скончыўся ў 1940 годзе. Абмен профсаюзных білетаў будзе прадаўжацца да 1 сакавіка 1941 года.

Зіма ў Кішынёве. На здымку: ля будынка электрасвета-вадалячэбніцы на Пушкінскай вуліцы.

Фото В. Іванова. (Фото ТАСС).

МІНЕРАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ КАРАЧАЯ

МІКАЯН-ШАХАР. У Карачаеўскай аўтаномнай абласці выяўлены багатыя нарзанныя, сераводародныя і гарачыя мінеральныя крыніцы.

Наяўнасць мінеральных вод, здаровы горны клімат ствараюць выключна спрыяючыя ўмовы для арганізацыі тут шырокай сеткі бальнеалагічных устаноў. У Тэбердынскім міжгор'і будуецца кліматычны курорт для лёгачных хворых. Ужо дзейнічаюць 4 санаторыі і 4 ламы адпачынку на 1.400 ложкаў.

У дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б)

ЛЕНІНСКІ ПЛАН ПРЫСТУПУ ДА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя ў СССР ужо ў першыя месяцы свайго існавання атрымала сусветна-гістарычныя перамогі. Быстра распаўсюдзілася ўлада Советаў па ўсёй краіне. Дыктатуры пролетарыята вельмі быстра, на працягу некалькіх месяцаў, удалося ажыццявіць важнейшыя рэволюцыйныя мерапрыемствы: зламаць стары, буржуазны дзяржаўны апарат і на яго месцы стварыць новы апарат совецкай дзяржавы; разбурыць астаткі саслоўнага ладу і рэжым нацыянальнага гнёту; услед за нацыяналізацыяй зямлі нацыяналізаваць усю буйную прамысловасць і т. д.

Першыя-ж мерапрыемствы дыктатуры рабочага класа ўмацавалі яе аўтарытэт у шырокіх масах працоўных, згуртавалі народы Расіі вакол совецкай улады. Гэта дало магчымасць Совецкай рэспубліцы перайсці ад «чырвонагвардзейскай атакі на капітал» да вырашэння больш складанай задачы — разгортвання соцыялістычнага будаўніцтва. У гэтую новую паласу развіцця, паласу пераходу ад разбурэння старога да будаўніцтва новага, пролетарская рэволюцыя ў Расіі ўступіла вясной 1918 года.

У гэты час Уладзімір Ільіч Ленін намячаў вялікі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Свае геніяльныя ідэі рэволюцыйнага пераўтварэння адсталай Расіі ў магутную краіну соцыялізма Ленін ізлажыў у артыкулах «Чарговыя задачы Совецкай улады», «Як арганізаваць спаборніцтва?» і ў іншых работах гэтага перыяду.

Адсталая народная гаспадарка Расіі была разбурана імперыялістычнай вайной і давядзена да поўнага краху контррэволюцыйным Часовым уралам Керэнскага. У першы перыяд існавання совецкай улады сабатаж буржуазіі і разгул дробнабуржуазнай стыхіі ў краіне пагоршылі і без таго цяжкое становішча народнай гаспадаркі. Большасць фабрык і заводаў у краіне прыпыніла сваю работу з-за адсутнасці сыравіны і паліва. Транспарт не спраўляўся нават са значна скарочанымі заданнямі прамысловасці. У гарадах адчуваўся востры недахоп у прадуктах харчавання. Рабочыя Масквы і Петраграда атрымлівалі па васьмушцы хлеба ў дзень і то не штодзённа.

Гаспадарчая разруха і голад, слабасць Расіі ў ваенных адносінах былі багаты небяспекамі для маладой Совецкай рэспублікі.

У гэтай цяжкай гістарычнай абстаноўцы Ленін вучыў партыю ўсямерна скарыстаць супярэчнасці паміж імперыялістычнымі дзяржавамі, з тым, каб прадоўжыць атрыманую намі часовую «перадышку». Трэба было ва што-б та ні стала дабіцца эканамічнага ўздыму краіны, умацавання яе абароназдольнасці.

У ленінскім плане прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва чырвонай нішчу праводзіцца такая мысль: пролетарская рэволюцыя павінна ажыццявіць велізарную станоўчую, творчую работу, павінна пабудаваць бясклассавае соцыялістычнае грамадства. У нетрах капіталізма толькі саспяваюць матэрыяльныя і соцыяльныя прадпасылкі для пролетарскай рэволюцыі. Але соцыялістычны спосаб вытворчасці ствараецца толькі дыктатурай рабочага класа. Яна знішчае старыя, капіталістычныя вытворчыя адносіны, якія сталі аковамі развіцця прадукцыйных сіл. Яна стварае новыя, соцыялістычныя вытворчыя адносіны, якія даюць шырокі прастор развіццю прадукцыйных сіл.

Для творчай дзейнасці дыктатуры рабочага класа патрабуюцца час і ўпорная барацьба з ажываючымі класамі. Ленін бязлітасна змагаўся з людзьмі, якія лічылі, што соцыялізм можна ўвесці дэкрэтам.

У такой адсталай краіне, якой была царская Расія, будаўніцтва соцыялізма звязана было з выключна вялікімі цяжкасцямі. Эканоміка Совецкай Расіі была многаўкладная. Ленін указваў на пяць грамадскіх эканамічных укладаў: патрыярхальная гаспадарка, дробнатаварная вытворчасць, прыватнагаспадарчы капіталізм, дзяржаўны капіталізм і соцыялізм. Перапляценне гэтых розных укладаў састаўляла, як указваў Ленін, своеасаблівасць становішча совецкай Расіі. Дробнатаварная вытворчасць пераважала ў эканоміцы краіны, і гэта было галоўнай пяжкасцю для соцыялістычнага будаўніцтва.

Дробнабуржуазныя элементы з'яўляліся базай для развіцця капіталізма ў краіне. Разам з прыватнакапіталістычнымі элементамі яны параджалі і развівалі дробнабуржуазную стыхію — спекуляцыю, мяшчаніцтва, імкненне да нажывы на народнай нястачы. Гэтая дробнабуржуазная стыхія захлёствала адсталыя слаі рабочага класа і пагражала самому існаванню совецкай улады.

«Мы маем, — гаварыў Ленін, — аднаго надзвычай небяспечнага тайнага ворага, які небяспечней многіх адкрытых контр-рэволюцыянераў; гэты вораг — смяротны вораг соцыялістычнай рэволюцыі і Совецкай улады... Вораг, аб якім я гаварыў, гэта стыхія дробнага ўласніка, які жыве ціной мысляю: «урваў, што можна, а там — хоць трава не расці»— гэты вораг мацней усіх Карнілавых. Путаўвых і Каледзіных, узятых разам». (Творы, т. XXII, стар. 432).

***

Ленінскі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва патрабаваў ад дыктатуры пролетарыята абуздання дробнабуржуазнай стыхіі. Найстражэйшы ўчот і кантроль над вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў — гэтую задачу Ленін лічыў галоўнай і рашаючай у барацьбе з дробнабуржуазнай стыхіяй.

Арганізацыя ўсенароднага ўчота і кантроля над вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў давала магчымасць соцыялістычнай дзяржаве мэтазгодна скарыстаць матэрыяльныя рэсурсы краіны; паспяхова змагацца з людзьмі, якія пагарджаюць інтарэсамі дзяржавы і напоўнь школу грамадству, заахвочваць чэсных тружанікаў, якія сваёй працай умацоўваюць эканамічную і ваенную магутнасць совецкай улады.

Перш за ўсё неабходна было наладзіць учот і кантроль у соцыялістычным сектары гаспадаркі краіны. Гэты сектар прадстаўляў эканамічную базу дыктатуры рабочага класа і аснову для разгортвання соцыялістычнага будаўніцтва.

З пачатку Кастрычніцкай рэволюцыі па сакавік 1918 года нацыяналізавана было 891 прамысловае прадпрыемства. У лістападзе 1917 года нацыяналізавана было 89 прамысловых прадпрыемстваў, у снежні—134, у студзені 1918 года—291. К канцу 1918 года ўся буйная прамысловасць і транспарт ужо знаходзіліся ў руках соцыялістычнай дзяржавы. Асноўная задача заключалася цяпер у тым, каб авалодаць гэтыя прадпрыемствы, наладзіць у іх строгі ўчот і кантроль вытворчасці і расходвання прадукцыі. Далейшая экспрапрыяцыя экспрапрыятараў ранейшымі тэмпамі без належнага асваення прадпрыемстваў магла толькі дыскрэдытаваць совецкую ўладу ў вачах мас. Праблему ўчота і кантроля Ленін распрацаваў дэтальна і ў такой агульнадаступнай форме, што кожнаму кіраўніку і радавому рабочаму ясна было, чаго патрабавала ад яго совецкая ўлада для эканамічнага ўздыму краіны. Вялзі акуратна і добразумленна лік грошай, гаспадарчай эканомна, не крадзі, захоўвай найстражэйшую дысцыпліну ў працы — гэтыя лозунгі Ленін лічыў чарговымі і галоўнымі бягучага моманту.

Ленін лічыў неабходным распаўсюджанне найстражэйшага ўчота і кантроля таксама на ўсе капіталістычныя прамысловыя прадпрыемствы.

***

Устанаўленню найстражэйшага, усёабнімаючага ўчота хлеба Ленін надаваў выключнае значэнне. «Барацьба за хлеб — гэта барацьба за соцыялізм», — гаварыў Ленін. Кулакі прабавалі голадам задушыць Совецкую рэспубліку. У іх былі вялікія запасы зернавых культур уражаяў 1916 і 1917 годаў, але яны адмаўляліся прадаваць хлеб дзяржаве. Рабочыя і вясковая беднота галадалі, а кулакі гнаілі хлеб у ямах. Вясковая буржуазія забатыравала хлебную манаполію і цвёрдыя цэны, устаноўленыя дзяржавай. Яна прадавала хлеб спекулянтам-мяшчанікам па казачна высокіх цэнах. Пытанне аб хлебе ў той час было рашаючым момантам класавай барацьбы.

Партыя заклікала працоўных на барацьбу з кулацтвам. Былі арганізаваны харчовыя атрады з перадавых рабочых прамысловых цэнтраў Расіі і камітэты беднаты ў вёсцы. Харчатрады рабочых і камбеды адыгралі гістарычную ролю ў зломе кулацкага сабатажа.

Значную цяжкасць прадстаўляла сабой арганізацыя ўчота і кантроля распыленай дробнатаварнай вытворчасці, якая пераважала ў краіне.

Марксізм-ленінізм вучыць, што пролетарыят абавязан адрозніваць дробных таваравытворцаў, уласнасць якіх грунтуецца на асабістай працы, ад буржуазіі, якая жыве за кошт эксплаатацыі працоўных мас. Да дробных таваравытворцаў нельга прымяняць метадаў насілля, прымяняемых да буржуазіі.

Метады ўчота і кантроля дробнатаварнай вытворчасці павінны былі ўмацаваць саюз рабочага класа з сялянствам, наблізіць сялян да соцыялістычнай вытворчасці. Па думцы Леніна, кааперацыя аблегчыла-б дзяржаве ажыццяўленне ўчота і кантроля над дробнатаварнай вытворчасцю. У той-жа час кааперацыя падрыхтавала-б дробных таваравытворцаў к пераходу на рэльсы соцыялізма. У «Першапачатковым наброску артыкула «Чарговыя задачы Совецкай улады» Ленін пісаў: «...становішча кааператываў у корані прынцыпова мяняецца з часу заваявання дзяржаўнай улады пролетарыятам, з моманту прыступу пролетарскай дзяржаўнай улады да сістэматычнага стварэння соцыялістычных параджаў. Тут колькасць пераходзіць у якасць» (Творы, т. XXII, стар. 423). Кааператыў у капіталістычным грамадстве — лавачка. Кааператыў у грамадстве, дзе нацыяналізаваны фабрыкі, заводы, зямля, вядзе да соцыялізма.

***

Ленінскі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва глыбока і ўсебакова намячае праблему павышэння прадукцыйнасці працы. Класікі марксізма-ленінізма даказалі, што кожнае новае грамадства перамагае старое тым, што яно стварае больш высокую прадукцыйнасць працы.

Ленін пястомна вучыў нашу партыю, як вучыць яе і таварыш Сталін, што павышэнне прадукцыйнасці працы — карэнная, галоўная задача соцыялістычнай рэволюцыі. Магчымасці росту прадукцыйнасці працы ва ўмовах дыктатуры рабочага класа бязмежны. Сродкі вытворчасці ў соцыялістычнай дзяржаве належаць народу, і, такім чынам, бесперапынна павышаюць матэрыяльны і культурны дабрабыт працоўных.

У студзені 1918 года Ленін пісаў: «Упершыню пасля стагоддзяў працы на чужых, падняволнай работы на эксплуататараў з'яўляецца магчымасць работы на сябе...» (Творы, т. XXII, стар. 161).

Ленін не абмежаваўся фармуліроўкай агульных палажэнняў аб прадукцыйнасці працы. Владзімір Ільіч вызначыў канкрэтныя шляхі і ўмовы, неабходныя для выканання гэтай задачы.

Першай умовай павышэння прадукцыйнасці працы, указваў Ленін, з'яўляецца барацьба за развіццё цяжкай прамысловасці, якая была ў царскай Расіі вельмі слаба развіта і тым аллюстроўвала яе адсталасць. У 1913 годзе Расія займала 6-е месца ў свеце па здабычы каменнага вугалю, 15-е — па вытворчасці электраэнергіі, 5-е—па вытворчасці сталі, 4-е—па машынабудаўніцтву; хімічная прамысловасці ў царскай Расіі не існавала зусім. Між тым па сваіх прыродных багаццях краіна займала адно з першых месц у свеце.

Ленін патрабаваў поўнага скарыстання прыродных багаццяў краіны для развіцця «матэрыяльнай асновы буйнай індустрыі», г. зн. цяжкай прамысловасці. Толькі такім шляхам можна было дабіцца ліквідацыі тэхнічнай адсталасці краіны і павышэння прадукцыйнасці працы.

У гэтай сувязі Ленін лічыў неабходным прыцягненне буржуазных спецыялістаў да нашага будаўніцтва і стварэнне сваёй тэхнічнай інтэлігенцыі.

Згодна ленінскіх патрабаванняў, партыя настойліва скарыстала старых спецыялістаў і разгарнула гіганцкую работу па стварэнню вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі рабочага класа.

Другой умовай павышэння прадукцыйнасці рабочага класа нашай краіны Ленін лічыў захоўванне найстражэйшай дысцыпліны ў працы. «...Поспех соцыялізма,—пісаў Ленін, — не мыслім без перамогі пролетарскай свядомай дысцыплінаванасці...» (Творы, т. XXII, стар. 454).

Пры дыктатуры рабочага класа карэнным чынам мяняюцца ўмовы працы. Дысцыпліна працы пазпарадкавана інтарэсам працоўных мас і садзейнічае бесперапыннаму паляпшэнню іх жыцця. Аднак не ўсе працоўныя адольны адразу асазнаць гэта. Перажыткі капіталізма ў эканоміцы і сазнанні людзей даўлеюць яшчэ над многімі. Гэта сказваецца ў недобрасумленных адносінах да працы, да соцыялістычнай уласнасці.

Ленін ўказваў, што выхаванне соцыялістычнай дысцыпліны працы павінна спалучаць у сабе меры пераканання і прымусу. Злосных нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны трэба карань, бо яны наносяць велізарную шкоду грамадству.

Вінаватага ў нарушэнні працоўнай дысцыпліны, пісаў Ленін, «трэба ўмець знаходзіць, аддаваць пад суд і каваць бялітасна» (Творы, т. XXII, стар. 460).

І зараз наша партыя, ідучы пад кіраўніцтвам Сталіна па ленінскаму шляху, прымае найстражэйшыя меры ўмацавання працоўнай дысцыпліны. Гэтыя мерапрыемствы адыгралі значную ролю ў выкананні народнагаспадарчага плана 1940 года.

Трэцяя ўмова павышэння прадукцыйнасці працы — гэта барацьба за соцыялістычны прынцып аплаты працы. Аплата па колькасці і якасці працы ўзмацняе зацікаўленасць кожнага рабочага ў павышэнні сваёй кваліфікацыі і прадукцыйнасці працы. Соцыялістычны прынцып аплаты працы ўлічвае асабістыя інтарэсы рабочых і падпарадкоўвае іх грамадскім інтарэсам. Ураўнілаўка — злейшы вораг соцыялізма. Пакуль не дасягнута вышэйшая фаза комунізма, неабходна ажыццяўляць строгі кантроль над мерай працы і спажывання. Вось чаму Ленін прапаноўваў увесці здзельную аплату працы, суразмерваць заработак з агульнымі вынікамі выпрацоўкі прадукта.

Ленін у гэты іменна перыяд высунуў сваю геніяльную ідэю соцыялістычнага спаборніцтва. Ленін гаварыў, што толькі ва ўмовах дыктатуры рабочага класа ставяцца магчымасці для спаборніцтва ў масавым маштабе.

«Соцыялізм, — пісаў Ленін,—не толькі не ўтаемае спаборніцтва, а наадварот, упершыню стварае магчымасць прымяніць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым размеры, уцягнуць сапраўды большасць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасці, выявіць таленты, якіх у народзе — непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, давіў, душыў тысячамі і мільёнамі» (Творы, т. XXII, стар. 158).

Ленінскія ідэі соцыялістычнага спаборніцтва ўвайшлі ў плоць і кроў совецкага народа, які тварыў сапраўды цуды, узводзячы велічны будынак соцыялістычнага грамадства. Таварыш Сталін развіў ленінскія ідэі аб соцыялістычным спаборніцтве, зрабіў іх здабыткам мільёнаў працоўных. Соцыялістычнае спаборніцтва стала асновай усёй нашай будаўнічай работы.

Ленін вучыў нас, што ўмацаванне дысцыпліны і павышэнне прадукцыйнасці працы не мысліма без цвёрдага адзінаначалля. Без адзінаначалля няма правільнай арганізацыі працы, асабліва ў буйнай прамысловасці, якая складае аснову соцыялізма. Цвёрдае адзінаначалле ў вытворчасці неабходна спалучаць з творчай ініцыятывай і самадзейнасцю шырокіх мас працоўных. У гэтым важнейшая асаблівасць соцыялістычнай арганізацыі працы.

Рабочы клас, натхнёны геніяльнымі ленінскімі ідэямі, горача ўзяўся за навядзенне большэвіцкага парадку на прадпрыемствах.

29 мая 1918 года Петраградскі совет рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў звярнуўся з адозвай да ўсяго працоўнага насельніцтва Петраграда і ваколіц.

«Рабочыя, — гаварылася ў адозве,— мы гаворым вам трэба ўзняць прадукцыйнасць працы. Трэба самім рабочым выпрацаваць норму прадукцыйнасці працы. Трэба ўвесці ўзаемны кантроль. Трэба стварыць рабочыя суды часці супроць нежадаючых працаваць і раскрадаючых народнае багацце. Трэба праводзіць сходы на заводах толькі ў нерабочы час. Кожная страчаная гадзіна працы павялічвае голад і зацягвае пятлю на шыі рабочага класа» («Петроградская правда», 30 мая 1918 г.).

Перафразіруючы гэтыя выдатныя словы, мы можам сказаць і цяпер: кожная страчаная гадзіна тармозіць справу далейшага ўмацавання абаронай і гаспадарчай магутнасці Совецкага Саюза. Ва ўмовах другой імперыялістычнай вайны, калі кожны дзень поўны для вялікай краіны соцыялізма ўсялякімі нечаканасцямі, мы не можам, мы не маем права зазнавацца нашымі поспехамі і павінны кожны дзень, кожную гадзіну ўсебакова скарыстаць для ўзмацнення магутнасці нашай радзімы.

***

Важнейшай умовай ажыццяўлення грандыёзнага плана соцыялістычнага будаўніцтва Ленін лічыў умацаванне дыктатуры рабочага класа. Пераходны перыяд ад капіталізма да соцыялізма ёсць перыяд жорсткай класавай барацьбы, якая праяўляецца ў розных формах. Палавіць супраціўленне буржуазіі рабочы клас можа толькі з дапамогай дыктатуры пролетарыята. Разам з тым, указваў Ленін, нельга забываць, што соцыялізм будуецца ў капіталістычным акружэнні; яно падтрымлівае астаткі эксплаататарскіх класаў у нашай краіне і засылае да нас сваіх агентаў.

Ленінскі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва выклікаў шалёнае супраціўленне з боку бухарынцаў і троцкістаў.

Таж званыя «левыя» комуністы былі ідэолагамі дробнабуржуазнай стыхіі. Недарма Ленін называў іх дробнымі буржуа, ашалеўшымі супроць рэжыма пролетарскай дыктатуры, супроць соцыялізма.

Партыя дала адпор троцкісцка-бухарынскім агентам буржуазіі і падняла рабочы клас на ажыццяўленне ленінската плана соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак поўнасцю ажыццявіць ленінскую ідэю ў гэты перыяд не ўдалося. Перашкодзіла пачаўшаяся грамадзянская вайна. Але нават у часе кароткатэрміновай «перадышкі» (студзень—красавік 1920 года) Ленін звяртаў увагу партыі на гаспадарчае будаўніцтва. Іменна ў дні часовай перадышкі Ленін паставіў на IX з'ездзе партыі пытанне аб адзіным гаспадарчым плане, у якім галоўнае месца адводзілася электрыфікацыі краіны. Электрыфікацыю ўсёй народнай гаспадаркі Ленін высоўваў як «вялікую праграму на 10—20 год». На аснове ленінскіх указанняў і быў распрацаван потым вядомы план ГОЭЛРО.

Пасля сканчэння грамадзянскай вайны партыя і совецкая ўлада перайшлі да новай эканамічнай палітыкі (нэп), распрацаванай Леніным. У гэтай мудрай палітыцы ленінскі план прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва атрымаў новае развіццё.

***

Таварыш Сталін пралоўжыў і развіў далей вучэнне Леніна аб пабудове соцыялізма ў адной краіне, аб соцыялістычным будаўніцтве. Сталінскае вучэнне аб індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі з'яўляецца неапанімым укладам у скарбніцу марксізма-ленінізма, у тэорыю і практыку соцыялістычнага будаўніцтва. Таварыш Сталін тэарэтычна абагаціў ленінскую праграму пабудовы соцыялізма ў нашай краіне і ўзначаліў практычнае ператварэнне ў жыццё вялікіх заветаў Ільіча.

Мы ўступілі ў перыяд завяршэння пабудовы соцыялізма і паступовага пераходу да комунізма. Мы ліквідавалі адсталасць нашай краіны ў галіне тэхнікі — СССР з'яўляецца першакласнай індустрыяльнай дзяржавай. З года ў год павышаецца прадукцыйнасць працы, шырыцца стаханаўскі рух — вышэйшая форма соцыялістычнага спаборніцтва.

Таварыш Сталін паставіў перад совецкім народам важнейшую сусветна-гістарычную задачу — дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў эканамічных адносінах. Вырашэнне гэтай задачы яшчэ больш умацуе гаспадарчую і абаронную магутнасць нашай краіны, забяспечыць такое багацце прадметаў спажывання, якое неабходна для пераходу да комуністычнага прынцыпа размеркавання.

Усё гэта патрабуе далейшага сістэматычнага павышэння прадукцыйнасці працы, умацавання працоўнай дысцыпліны, адзінаначалля, выхавання беражлівых адносін да соцыялістычнай уласнасці, ажыццяўлення найстражэйшага кантроля над вытворчасцю і спажываннем. Усё гэта патрабуе няўхільнага выканання ўказанняў Леніна і Сталіна аб барацьбе з лоцырамі, дармаедамі, з дэзарганізатарамі вытворчасці і раскрадальнікамі грамадскага дабра, з людзьмі, якія імкнуцца ўрваць ад дзяржавы пабольш і хапць ёй пменш. Гэтыя людзі наносяць велізарную шкоду соцыялістычнай гаспадарцы.

Ідэі Леніна, ізложаныя ў яго геніяльным плане прыступу да соцыялістычнага будаўніцтва, служаць нам і па гэты дзень кіраўніцтвам да дзеяння, асвятляюць нам шлях руху да комунізма.

М. ВЕРШЫК.

У бібліятэцы-чытальні імені Герцэна г. Гомеля. За самастойным вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» студэнты IV курса лесаінстытута П. Якуценка (злева), А. Шастоў і В. Глытоў. Фото А. Шаевіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

Знішчальная авіяцыя

25 год назад, у 1915 годзе, на заходнім фронце паявілася новая грозная зброя паветранай вайны — самалёт-знішчальнік, які меў узбраенне (адзін кулямёт) і, самае галоўнае, вялікую вертыкальную і гарызантальную скорасць, што дазваляла яму збіваць бамбардыровачныя і разведчыя самалёты.

Паяўленне знішчальных самалётаў было выклікана неабходнасцю барацьбы з паветранымі разведчыкамі і бамбардыроўшчыкамі праціўніка. У лютым 1915 года французы ўвялі аднамясцовы знішчальны самалёт «Ньюпор», узброены адным кулямётам. Летам таго-ж года і ў немцаў паяўляецца знішчальны самалёт больш удасканаленай канструкцыі, «Фокер», таксама ўзброены адным кулямётам, страляючым праз вінт. Гэтыя самалёты ўладалі скараснямі каля 130—140 кілометраў у гадзіну, у той час як скорасць разведчых і бамбардыровачных самалётаў — 80—110 кілометраў у гадзіну.

Перавага ў скорасці і ўзбраенні дазваляла знішчальнікам бязлітасна збіваць разведчыя і бамбардыровачныя самалёты, прывязныя аэрастаты і дырыжаблі праціўніка. Тым самым знішчальная авіяцыя абараняла свае войскі ад паветранай разведкі і бамбардыроўкі, забяспечваючы ў сваю чаргу сваёй авіяцыі магчымасць выканання гэтых задач.

Бамбардыроўшчыкі і разведчыкі вымушаны былі перанесці сваю баявую работу на ноч. Затым, па меры колькаснага і якаснага росту знішчальнай авіяцыі, ў 1916 годзе разведчыкі і бамбардыроўшчыкі пачынаюць дзейнічаць буйнымі групамі пад прыкрыццём сваіх знішчальнікаў, суправаджаючых іх да цэляў і назад. Этап адзіночных паветраных баёў знішчальнікаў з разведчыкамі і бамбардыроўшчыкамі змяняецца спачатку этапам адзіночных, а затым і групавых паветраных баёў знішчальнікаў са знішчальнікамі. Пачалася і не спынялася да самага канца вайны барацьба за завяванне панавання ў паветры.

На працягу першай імперыялістычнай вайны знішчальная авіяцыя павялічвалася колькасна, расла якасна і мяняла свае арганізацыйныя формы.

У канцы 1918 года знішчальная авіяцыя характарызавалася наступнымі данымі: Англія — 43,2 процанта ўсяго састава ваенна-паветраных сіл, Францыя — 40,5 процанта, Германія — 37,4 процанта. За гэты-ж час скорасць знішчальнікаў павялічылася з 120 — 130 кілометраў у гадзіну да 220 кілометраў; вышыня пад'ёму — з 4.000 метраў да 6.500; замест аднаго кулямёта знішчальнікі мелі ўжо два кулямёты і адну гармату.

На працягу першай імперыялістычнай вайны знішчальнай авіяцыяй абодвух бакоў было збіта 8.073 самалёты, з іх саюзнікамі —3.138 і немцамі — 4.935, у той час як зенітнай артылерыяй абодвух бакоў было збіта ўсяго 2.347 самалётаў.

Характэрна, што і зараз у паветранай вайне паміж Англіяй і Германіяй найбольшую колькасць збітых самалётаў даюць паветраныя баі. Ад асобных эскадрыльяў у пачатку вайны знішчальная авіяцыя стала пераходзіць да буйных авіяцыйных злучэнняў. Налёты германскіх бамбардыроўшчыкаў на Парыж і Лондан прывялі к таму, што, апрача знішчальнай авіяцыі прыфрантавой зоны, узнікла знішчальная авіяцыя, уваходзячая ў сістэму проціпаветранай абароны буйных пунктаў.

У сувязі з паляпшэннем лётна-тактычных якасцей бамбардыровачных самалётаў выказваліся меркаванні, што знішчальная авіяцыя нібы аджыла свой век, што паветраны бой можа весціся адным бамбардыроўшчыкамі, і т. д.

Аднак скарыстанне знішчальнай авіяцыі ў Іспаніі і Кітаі паказала, што пры наяўнасці добра падрыхтаванага лётнага састава, сучаснай матэрыяльнай часткі і ўзбраення знішчальнік паранейшаму з'яўляецца грознай зброяй у барацьбе за панаванне ў паветры.

У Іспаніі рэспубліканскія скарасныя бамбардыровачныя самалёты доўгі час абыходзіліся без суправаджэння знішчальнікаў; калі-ж у мяцежнікаў паявіліся скарасныя знішчальнікі «Месершмідт Ме-109», рэспубліканцы таксама сталі прыбягаць да дапамогі знішчальнікаў. Тое-ж адбылося і на кітайскім тэатры ваенных дзеянняў, дзе японцы вымушаны былі суправаджаць свае бамбардыроўшчыкі знішчальнікамі пры палётах у тыл праціўніка.

Вопыт вайны ў Іспаніі і Кітаі пацвердзіў эфектыўнасць скарыстання знішчальнікаў для знішчэння авіяцыі праціўніка на яе аэрадромах, для атакі войск на паходзе і на полі бою.

У баях у раёне возера Хасан нашы знішчальнікі з поспехам прымяняліся для рашэння многіх баявых задач. Лятаючы на невялікай вышыні, яны расстрэльвалі ва ўпор японскую пяхоту, артылерыю на пазіцыях, камандныя пункты, штабы і вузлы сувязі.

На Халхін-Голе наша знішчальная авіяцыя да пачатку рашучых дзеянняў заваявала поўнае панаванне ў паветры. У адбываўшыхся там буйных паветраных баях прымала ўдзел з абодвух бакоў да 300 — 400 і больш самалётаў. Гэтыя баі паказалі, як важна мець буйныя рэзервы знішчальнікаў, якія ў патрэбныя моманты могуць быць кінуты на рашаючыя ўчасткі паветранага бою.

У баях з белафінамі совецкія знішчальнікі таксама паказалі сваю выдатную баявую работу. За ўвесь час вайны ні адзін белафінскі самалёт не паказваўся над Ленінградам. Панаванне ў паветры было заваявана нашай авіяцыяй. Вельмі эфектыўнымі былі дзеянні знішчальнікаў (асабліва гарматных) для выводу са строю паравозаў і чыгуначных эшалонаў. З поспехам скарыстоўваліся знішчальнікі для разведкі ў бліжнім тылу праціўніка.

У баях на заходнееўрапейскім фронце знішчальная авіяцыя прымала непасрэдны ўдзел у паветраных і наземных аперацыях.

Нямецкія знішчальнікі атакоўвалі аэрадромы саюзнікаў як самастойна, так і ў якасці прыкрыцця бамбардыровачных груп, дзейнічалі сумесна з наземнымі войскамі, забяспечваючы ім поспех.

Французскія лётчыкі-знішчальнікі паказалі досыць высокую тактычную вывучку, але з-за невысокіх якасцей матэрыяльнай часткі самалётаў яны дзейнічалі вельмі асцярожна.

Французскае камандаванне прымяняла для дзеянняў супроць танкаў гарматныя знішчальнікі «Моран-406» і ўстаравўшыя знішчальнікі «Дэвуацін — 501» і «Дэвуацін—510». Вялікая меткасць гарматнага агню з пікіравання і яго эфектыўнасць дазволілі французскай авіяцыі нанесці германскім бронетанкавым і матарызаваным дывізіям досыць значныя страты.

У раёне Седана ў буйных паветраных баях упершыню прынялі ўдзел англійскія двухмясцовыя знішчальнікі Бультон Поль «Дыфаент», узброеныя чатырохкулямётнай вежай і двума гарматамі «Мадсен».

Англа-французскія знішчальнікі прыкрывалі адыход сваіх войск і ў асаблівасці эвакуацыю саюзных войск з Дзюнкерка.

У англа-германскай паветранай вайне, прыняўшай зараз найбольш вострыя формы, знішчальная авіяцыя прадаўжае адыгрываць рашаючую ролю ў дзеяннях абодвух бакоў. Германскія знішчальныя самалёты маюць магутнае стралковае і гарматнае ўзбраенне, вялікі радыус дзеяння, добрую манеўранасць. Магутны двухматорны знішчальнік «Месершмідт Ме-110» скарыстоўваецца германскай авіяцыяй для суправаджэння бамбардыроўшчыкаў і для патруліравання.

Адсутнасць у англічан двухматорных знішчальнікаў дальняга дзеяння не дазваляе ім скарыстоўваць бамбардыровачную авіяцыю ў дзённы час.

Па даных шведскіх і амерыканскіх газет, англійскія знішчальнікі ўзброены гарматамі, якія страляюць фугаснымі гранатамі малога калібра, прабіваючымі броню нямецкіх самалётаў.

Несумненна, што па меры далейшага якаснага і колькаснага росту самалётаў знішчальнай авіяцыі будуць змяняцца формы і метады яе баявога прымянення.

Ад адзіночных паветраных баёў у 1915 годзе да буйнейшых паветраных баёў 1940 г., з удзелам 500—600 самалётаў з абодвух бакоў; ад узбраення адным кулямётам да 5—8 кулямётаў і да 1—2 гармат; ад скорасці ў 120 — 130 кілометраў у гадзіну да 550—670 кілометраў у гадзіну — такі шлях, пройдзены знішчальнай авіяцыяй за 25 год.

Колькасць машын знішчальнай авіяцыі у сучасных буйнейшых паветраных флотах дасягае цяпер 50 — 55 проц. агульнага састава ваенна-паветраных сіл.

Лётна-тактычныя якасці самалётаў-знішчальнікаў, вопыт іх баявога прымянення паказваюць, што на знішчальную авіяцыю могуць быць ускладзены наступныя задачы: заваяванне панавання ў паветры; прыкрыццё сваіх наземных войск і забеспячэнне баявой работы сваёй бамбардыровачнай і разведчай авіяцыі; абарона важнейшых буйных пунктаў у сваім глыбокім тылу; атака наземных войск праціўніка на паходзе і ў баі.

Асноўным назначэннем знішчальніка з'яўляецца паветраны бой. Лётчык-знішчальнік павінен пастаянна шукаць праціўніка ў паветры, а не ўхіляцца ад паветранага бою.

Лётчыкі-знішчальнікі Чырвонай Арміі, беззаветна адданыя сваёй соцыялістычнай радзіме і партыі Леніна—Сталіна, не раз даказалі на справе сваю волю да перамогі, свой гераізм, аснаваны на высокай тэхніцы пілатыравання ва ўмелым спалучэнні з меткім агнём.

Вялікі лётчык нашага часу Валерый Паўлавіч Чкалаў—вось узор лётчыка-знішчальніка Героі Совецкага Саюза тт. Сероў, Грыцэвец, Краўчанка, Дзенісаў, Лакеєў і іншыя паказалі, якімі павінны быць лётчыкі-знішчальнікі.

Палкоўнік Е. ЧАЛІК.

БУДАЎНІЦТВА НОВЫХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ

З года ў год расце энергетычная гаспадарка нашай рэспублікі. Расшыраюцца існуючыя электрастанцыі, будуюцца новыя цепла-электрацэнтралі прамысловага тыпу, якія павінны забяспечыць сваіх спажыўцоў не толькі электраэнергіяй, але і цяплом.

Самая буйная ў БССР раённая электрастанцыя імені Сталіна—Белдрэс, магутнасцю ў 20 тыс. кіловат, абслугоўвае гарады Віцебск, Оршу, Магілеў, Дуброўна і інш.

Разам з тым, энергетычная база рэспублікі адстае ад патрабаванняў народнай гаспадаркі. У асноўных прамысловых цэнтрах—Мінску, Гомелі, Бабруйску, Віцебску, Магілеве—адчуваецца востры дэфіцыт электраэнергіі. У зачатачным стане знаходзіцца электрыфікацыя сельскай гаспадаркі. З 10 тыс. калгасаў па рэспубліцы электрыфікаваны толькі 230.

Партыя і ўрад узяляюць велізарную ўвагу развіццю энергагаспадаркі. У 1940 годзе на будаўніцтва электрастанцый было асігнавана больш 10 млн. рублёў. Пушчаны ў эксплаатацыю Ельская, Расонская і Касцюковіцкая электрастанцыі. Заканчваецца будаўніцтва Уздзенскай, Мазырскай электрастанцый і другой чаргі ГЭС-2 у Мінску.

Значна павялічваюцца энергетычныя рэсурсы рэспублікі ў 1941 годзе. Намечана будаўніцтва электрастанцыі на базе смалявіцкага торфмасіва.

Пачаліся падрыхтоўчыя работы на Васілевіцкіх тарфяных балотах, якія павінны з'явіцца паліўнай базай для новай электрастанцыі. Тут праведзены ўжо праектна-вышукальныя работы. Зараз прыступлена да складання тэхнічнага праекта новай станцыі.

За апошні час уступілі ў эксплаатацыю многа дробных гідраэлектрастанцый. Колькасць іх павялічваецца. Трэба адзначыць, што пры будаўніцтве і мантажы абсталявання гэтых станцый зусім не прытрымліваюцца неабходных тэхнічных умоў. Абслугоўваюцца яны ў многіх выпадках некваліфікаванымі кадрамі, што прыводзіць да частых астановак і аварый.

Наркамзему БССР і Упраўленню мукамольнай прамысловасцю пры СНК БССР неабходна правесці ў 1941 годзе курсы па падрыхтоўцы дзесятнікаў-будаўнікоў гідраэлектрастанцый і электраманцёраў-механікаў малых ГЭС.

П. А. МАСКАЛЁЎ,
інжынер-энергетык.

Спаборніцтва цэментшчыкаў

ВАЛКАВЫСК, 3 студзеня. (БЕЛТА). Заклік калектыва ленінградскага цэментнага завода імені Вароўскага аб арганізацыі ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва цэментшчыкаў знайшоў гарачы волгук сярод рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода «Рось». У адказ на заклік ленінградцаў калектыў прадпрыемства абавязаўся да 10 снежня выканаць вытворчую праграму 1941 года, павысіць на 7 проц. супроць плана прадукцыйнасць працы, знізіць на 5 проц. сабекошт прадукцыі.

Цэментшчыкі Валкавыска выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых Здаўбуноўскага (Заходняя Украіна) цэментнага завода.

3.270 тысяч пар абутку

Мінская абутковая фабрыка імені Кагановіча атрымала вытворчае заданне па выпуску прадукцыі на 1941 год. Фабрыка выпусціць 3.270 тысяч пар абутку, з іх хромавага мужчынскага — 546 тысяч пар, хромавага жаночага — 450 тысяч пар, хромавага хлапчуковага — 546 тысяч пар, тэкстыльнага мужчынскага абутку — 597 тысяч пар, жаночага — 597 тысяч пар і інш.

Стахановец-токар новамеханічнага цэха мінскага станкабудаўнічага завода імені Кірава С. Когаль, які выканаў у першы дзень работы 1941 года — 2 студзеня — сваю норму на 180 проц. Фото Б. Вернера. (Фотахроніка БЕЛТА).

САДОВА-АГАРОДНАЯ БРЫГАДА ОРДЭНАНОСНАГА КАЛГАСА

Наш калгас праславіўся высокімі ўраджаямі далёка за межамі рэспублікі. Два годы падрад калгас і лепшыя яго людзі — перадавікі вытворчасці—былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Саюзны ўрад высока ацаніў дасягненні калгаса і ўдастоіў яго вышэйшай узнагароды — ордэна Леніна.

Я — брыгадзір садова-агароднай брыгады. Хачу коратка расказаць аб сваёй рабоце па вырошчванню багатых ураджаяў садавіны і гародніны.

Суровую зіму 1939—40 года плодовы сад нашага калгаса перанёс даволі лёгка. Захаванню сада, безумоўна, у значнай ступені садзейнічала правільнае прымяненне агратэхнікі. У 1940 годзе ўраджай плодаў значна вышэйшы, чым у папярэднія гады. З 12 гектараў плоданосячага сада мы атрымалі 1614.4 цнт. салавіны.

Такі-ж высокі ўраджай і гародніны: агуркоў і памідораў. Пад агуркамі ў нас было занята ўсяго 1,5 гектара, але і з гэтага ўчастка мы атрымалі 526 цэнтнераў агуркоў, за якія выручылі 23.688 рублёў чыстага прыбытку.

Памідораў было 0,50 гектара. З гэтага невялікага ўчастка дзякуючы правільнай агратэхніцы мы атрымалі 200 цнт. спелых памідораў. Ад продажу іх дзяржаве калгас атрымаў 16.940 рублёў прыбытку.

Даходнай галіной нашай гаспадаркі з'яўляецца таксама табакаводства. Сеем махорку. Ёю было занята 7 гектараў лепшай глебы. Атрыман нядрэнны ўраджай — па 44,84 цнт. сухога табачнага ліста з гектара. Усю прадукцыю здалі дзяржаве — 85 проц. першым і 15 проц. — другім і трэцім сартамі.

Зараз у калгасе распрацоўваюцца мерапрыемствы па далейшаму ўздыму ўраджайнасці. Прымяненне іх на шырокіх масівах забяспечыць калгасу далейшы рост даходаў ад садоўніцтва і гародніцтва.

А. ГАНЧАРОЎ,
брыгадзір садова-агароднай брыгады ордэна Леніна калгаса імені Тэльмана, Брагінскага раёна, узнагароджаны Вялікай залатой медаллю.

НЯМА БАРАЦЬБЫ З НАРУШАЛЬНІКАМІ СТАТУТА СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ

ОРША. Яшчэ ў 1936 годзе грашовыя даходы калгасаў раёна складалі ўсяго 6.813 тысяч рублёў. Праз два годы ды дасягнулі 8.664 тысячы рублёў, а ў 1939 годзе—10.435 тысяч рублёў.

У 1940 годзе грашовыя даходы калгасаў узраслі яшчэ больш. Па папярэдніх даных, у калгасе «Чырвоная Харкаўка», Панізоўскага сельсавета, у параўнанні з 1939 годам грашовыя даходы ўзраслі на 84 тысячы рублёў, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік», Баранскага сельсавета,— на 21 тыс. рублёў.

Рост грашовых даходаў — рэзультат штодзённых клопатаў аб умацаванні грамадскай гаспадаркі, аб папаўненні недзялімых фондаў. Прыкладам могуць служыць калгасы Пішчалаўскага сельсавета. У 1938 годзе адлічэнні калгасаў у недзялімы фонд складалі 92.592 рублі, а ў 1939 годзе ўжо 115.890 рублёў. Калгасы Шапкоўскага сельсавета ў 1939 годзе адлічылі ў недзялімы фонд на 21.507 рублёў больш, чым у 1938 годзе.

Такія клопаты аб грамадскай гаспадарцы праяўляюцца далёка не ва ўсіх калгасах раёна. Карыстаючыся бескантрольнасцю з боку работнікаў райземаддзела, мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, некаторыя праўленні калгасаў сталі на антыкалгасны шлях. Ёсць калгасы, якія зусім не папаўняюць недзялімыя фонды, або выдзяляюць для гэтага зродкі, а затым разбазарваюць іх.

Калгасы «Ударнік» і «Вызваленне жанчын», Браздзечанскага сельсавета, «Шлях сацыялізма» і «Ленінец», Будаўскага сельсавета, і «Зара», Веравайшанскага сельсавета, сумы, адлічаныя ў недзялімыя фонды, не пералічалі на свой рахунак у Сельгасбанку. Калгасы «Новы свет», Высоцкага сельсавета, «Чырвоны партызан», Кудаеўскага сельсавета, «Шлях сацыялізма», Гальцэўскага сельсавета, і «Новае жыццё», Смальянскага сельсавета, адлічылі ў недзялімыя фонды толькі 10 проц. грашовых даходаў 1938 г. А ў калгасе «Ленінская іскра», таго-ж Кудаеўскага сельсавета, зусім не папаўнялі недзялімы фонд.

У калгасе «Чырвоны чыгуначнік» з даходаў 1938 года недаўнеслі 10.109 рублёў, з даходаў 1939 года — 12.770 рублёў.

У некаторых калгасах сродкі, якія павінны ісці ў недзялімы фонд, разбазарваюцца, размяркоўваюцца на працадні. У калгасе «Чырвоны бераг» атрыманыя ад продажу каня і страхавыя (усяго 4 тыс. руб.) размеркавалі на працадні. У калгасе «Высокая зорка» таксама размеркавалі на працадні 1.100 рублёў, атрыманых ад продажу калгасных коней.

Мясцовыя і раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі павінны рашуча змагацца з усякімі спробамі парушэння статута сельгасарцелі.

Е. ЖУКОЎСКІ.

НАШ ВОПЫТ РАБОТЫ З РАБСЕЛЬКОРАМІ

Рэдакцыя газеты «Шлях да комунізма», Камарынскага раёна, у лютым мінулага года арганізавала спецыяльныя курсы для рабселькораў і рэдактараў насценгазет. На іх рэгулярна займаюцца 30 завочнікаў.

Пры ўкамплектаванні курсаў рэдакцыяй былі ўлічаны памылкі мінулых год, калі на вучобу нярэдка прымаліся людзі, якія нічога агульнага не мелі з большэвіцкім друкам, з работай калгасаў або прадпрыемстваў. Вялікая ўвага была таксама ўдзелена падбору аднароднага па сваіх ведах састава слухачоў.

Перад пачаткам вучэбнага года ўсе завочнікі былі падрабязна азнаёмлены з мэтамі і задачамі курсаў, а таксама з тэматычным планам вучобы.

Многія калгасы раёна знаходзяцца ў 50—60 кілометрах ад раённага цэнтра. Гэтая акалічнасць прымусіла некалькі змяніць форму вучобы. Мы сталі шырока прымяняць індывідуальныя і групавыя кансультацыі. Але галоўным відам вучобы з'яўляецца самастойная работа над кнігай. На кансультацыях раз'ясняем незразумелыя пытанні, дапамагаем завочнікам прымяняць набытыя веды ў сваёй практычнай рабоце. Часта практыкуем агляд асобных пасценных газет. Гэтыя агляды дапамагаюць членам рэдкалегій быстра ліквідаваць недахопы ў іх рабоце. Падобныя кансультацыі праводзім і непасрэдна ў сельсоветах, на іх, апрача завочнікаў, прысутнічаюць усе астатнія члены рэдкалегій, перадавыя калгаснікі.

У дапамогу завочнікам высылаем неабходную літаратуру і розныя дапаможныя матэрыялы. Так, яшчэ ў пачатку вучобы рэдакцыя выслала ўсім навучаючымся брашуру П. К. Крупскай «Як самастойна працаваць над кнігай».

Кожны работнік рэдакцыі пры выездзе ў калгас, на прадпрыемства падрабязна знаёміцца з работай і вучобай завочнікаў, дае ім вычарпальныя адказы на незразумелыя пытанні.

Завочная вучоба аказала значны ўплыў на работу рэдкалегій. Палепшылася якасць змяшчаемых матэрыялаў. Гэта відаць на прыкладзе насценгазет калгасаў «Дняпроўскі араты» і «Рухавік рэволюцыі». Яны выходзяць бесперабойна, добра афарміляюцца, змяшчаюць цікавыя матэрыялы з жыцця калгасаў. Многія слухачы курсаў сталі часцей пісаць у сваю раённую газету. Вось, напрыклад, тт. Капуба, Кляпец, Гелер, Шайкевіч і іншыя за мінулы год напісалі па 10—15 заметак.

Трэба адзначыць, што мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі слаба дапамагаюць завочнікам-селькорам. Горш таго, асобныя партыйныя кіраўнікі сталі на шлях глушэння крытыкі. Калі рэдкалегія насценгазеты калгаса «Чырвоны араты» ўказала на нетахопы ў рабоце старшыні калгаса тав. Гудзенка, то парторг тав. Цеслянок загадала зняць насценгазету. Моў, крытыкуюць «надта востра». Факты зрыву заметак з насценгазеты мелі месца ў калгасе імені Карла Маркса і на крухмальным заводзе № 8.

Вучоба з рабселькорамі—сур'ёзная і адказная справа. Партыйныя арганізацыі абавязаны ўзмацніць кіраўніцтва гэтым участкам работы.

А. А. КУРЛОВІЧ,
рэдактар камарынскай райгазеты «Шлях да комунізма».

Вясёлы адпачынак школьнікаў

БРЭСТ. Весела і цікава пачаліся зімовыя канікулы ў школьнікаў Брэста. Дзеці праводзяць свой адпачынак на катках, робяць вылазкі за горад, наведваюць кінатэатры.

У распараджэнне школьнікаў прадастаўлен каток таварыства «Спартак». Днямі пачнуцца спаборніцтвы па канках. Зараз прахо дзяць спаборніцтвы па гімнастыцы, у якіх прымаюць удзел 200 вучняў.

Штодзённа ў Доме піянераў праводзяцца цікавыя ігры. 7 студзеня пачнецца шахматна-шашачны турнір паміж камандамі Брэста і Пінска. Будуць праведзены літаратурныя і абаронныя вечары, сустрэчы дзяцей са знатнымі людзьмі і камандзірамі Чырвонай Арміі. (БЕЛТА).

Аўтагурток пры хаце-чытальні

ВАЛКАВЫСК. Пры хаце-чытальні Ізабеліцкага сельсавета арганізаван гурток па вывучэнню аўтамабіля. Гурток кіруе шофер тав. Рыбакоў. 17 чалавек без адрыву ад асноўнай работы авалодваюць аўтасправай.

Да XXIII гадавіны РСЧА адбудзецца выпуск гуртка. (БЕЛТА).

БІБЛІЯГРАФІЯ

„Бібліятэка стаханаўскага вопыту"

За перыяд існавання Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў сельскай гаспадарцы нашай рэспублікі накапіўся багаты вопыт барацьбы за высокія ўраджаі і развіццё жывёлагадоўлі. Перадавыя людзі — стаханаўцы ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці паказалі сапраўдныя ўзоры сацыялістычнай працы, заваявалі пачотнае права ўдзелу ў выстаўцы.

Каштоўны вопыт гэтых людзей, зразумела, далёка выходзіць за рамкі чыста практычных задач у асобных галінах сельскай гаспадаркі. Дзейнасць стаханаўцаў не толькі ўзбагачае нашу практыку, але дае вялікі матэрыял для тэарэтычных абагульненняў, прад'яўляе пэўныя патрабаванні агранамічнай навуцы і тым самым рухае наперад навуковую мысль. «Перамога сацыялізма, — пісаў акадэмік Вільямс, — нарадзіла моцны і ўсёперамагаючы саюз працы і навукі. Агранамічную навуку ўзялі ў свае рукі мільёны свабодных працаўнікоў вёскі. Навука дзякуючы такому саюзу набыла магутную сілу і новы напрамак развіцця».

Вось чаму навуковае абагульненне і шырокая папулярызацыя сярод калгаснікаў, рабочых МТС і соўгасаў стаханаўскага вопыту мае выключна важнае значэнне для далейшага ўздыму прадукцыйнасці працы, для павелічэння сельскагаспадарчай прадукцыі ў краіне.

З гэтай мэтай рэдакцыя сельскагаспадарчай і тэхнічнай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва пры СНК БССР, пры ўдзеле работнікаў Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі Акадэміі навук, жывёлагадоўчай і плодагародніцкай навукова-даследчых станцый і Наркамзема БССР, яшчэ ў 1939 годзе пачала выданне спецыяльнай серыі кніг—«Бібліятэка стаханаўскага вопыту». На працягу апошніх двух год выйшлі з друку 34 кніжкі гэтай серыі, агульным тыражом у 291 тысячу экземпляраў, з іх у 1940 годзе выпушчана 13 брашур.

Па сваёй тэматыцы «Бібліятэка стаханаўскага вопыту» ахватвае амаль усе галіны сельскагаспадарчай вытворчасці. У брашурах апісваецца вопыт перадавых калгасаў, ферм і перадавікоў сельскай гаспадаркі — удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Вось, напрыклад, брашура **І. Чэрняўскага** «Калгас перадавік» прысвечана ордэнаноснаму калгасу імені Валадарскага, Магілёўскага раёна, які ўжо 2 годы ўдзельнічае ў выстаўцы. Аўтар не толькі прыводзіць даныя аб росце ўраджайнасці зернавых, тэхнічных культур, бульбы, але расказвае, як калгас дабіўся гэтых ураджаяў. У брашуры апісана агратэхніка, роля МТС у калгаснай вытворчасці, арганізацыя працы і сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасе.

У брашуры **К. Гулейчыка** «На асушаных балотах Палесся» паказаны дасягненні і вопыт работы ордэнаноснага калгаса імені Беларускай Асобай Ваеннай Акругі, Любаньскага раёна, па асваенню балот і ператварэнню іх у квітнеючыя сацыялістычныя палі.

Брашура **В. Прыбытковскага** і **А. Гайко** «Племянная ферма ордэнаноснага соўгаса «Крынкі» паказвае дасягненні гэтай фермы і соўгаса па вырошчванню буйнай рагатай жывёлы швіцкай пароды і ўздыму яе прадуктыўнасці.

Аб дасягненнях перадавой аўцагадоўчай фермы расказвае брашура **Е. Любоцкага** і **О. Лагашкіна**—«Аўцагадоўчая ферма калгаса «Чырвоны ўсход» (Кіраўскі раён).

Перадавой МТС прысвечана брашура **А. Самко**—«Беларуская МТС» (Бялыніцкі раён).

Пяць кніжак з «Бібліятэкі стаханаўскага вопыту», выданых у 1940 годзе, з'яўляюцца больш грунтоўнымі работамі, у якіх паказан і, наколькі гэта ўдалося, навукова абагулен перадавы вопыт стаханаўцаў асобных галін сельскай гаспадаркі як нашай рэспублікі, так і іншых абласцей і рэспублік Саюза. Пры гэтым, зразумела, улічаны канкрэтныя ўмовы і задачы сельскай гаспадаркі БССР.

Да выданняў такога характару адносяцца кнігі: **І. Власенка** і **Е. Павяротная**—«Агратэхніка перадавікоў ільнаводства», **А. Раўдо, М. Грыхуцін** і **Е. Юркоў** — «За стаханаўскія ўраджаі бульбы», **Л. Скрыпнічэнка, А. Касаткін** — «Асвоім вопыт перадавікоў гародніцтва», **А. Сюбараў** і **К. Хабенка** — «Плодовыя культуры».

Апрача таго, у 1940 годзе выдана брашура **І. Чэрняўскага** «Калгасы Тураўскага раёна», у якой расказваецца аб вялікіх гаспадарчых і культурных дасягненнях калгасаў гэтага раёна, аб прымяняемай імі агратэхніцы, арганізацыі працы, сацыялістычным спаборніцтве і рабоце раённай партыйнай арганізацыі ў калгасах. Гэты раён у цэлым быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года.

Не гледзячы на рад недахопаў, якія сустракаюцца ў кнігах (сухасць выкладання матэрыялу ў асобных работах, некаторыя стылістычныя пагрэшнасці і т. п.), можна без перабяльшэння сказаць, што «Бібліятэка стаханаўскага вопыту» з'яўляецца вельмі каштоўным дапаможнікам.

Калгаснікі, рабочыя МТС і соўгасаў, работнікі зямельных органаў, спецыялісты, студэнты сельскагаспадарчых навучальных устаноў, слухачы розных сельскагаспадарчых курсаў і гурткоў—усе, хто працуе ў сельскай гаспадарцы і вывучае яе, знойдуць у «Бібліятэцы стаханаўскага вопыту» многа для сябе цікавага і карыснага. Таму вельмі важна, каб кожная кніжка з гэтай бібліятэкі была даведзена да свайго «спажыўца», каб лепшыя ўзоры стаханаўскай работы былі шырока папулярызаваны ў калгасах і соўгасах.

Кнігагандлюючыя арганізацыі, асабліва ў раёнах, павінны паклапаціцца, каб увесь тыраж указаных брашур быў поўнасцю рэалізаван. А райкомам КП(б)Б належала-б шырока скарыстаць гэтую бібліятэку для агітацыйнай работы ў калгасах і соўгасах.

Н. ПУЗІКАЎ.
ст. рэдактар сельскагаспадарчай і тэхнічнай літаратуры Дзяржвыдавецтва пры СНК БССР.

ПЕРАМОГІ ДОБРУШСКІХ РАБОЧЫХ

Калектыў Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы», замацаваўшы поспехі, дасягнутыя ў перадкастрычніцкім сацыялістычным спаборніцтве, змагаецца за новыя вытворчыя перамогі.

Шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы—да дня адкрыцця партканферэнцыі знізіць аддзелачны брак на 1 проц., зменшыць прамы валакна на 0,9 проц., павялічыць выпуск прадукцыі 1-га сорту на 8 проц., стварыць скразную стаханаўскую брыгаду.

За абавязацельствамі паследавалі канкрэтныя справы. Папяровы цэх выконвае дзённае вытворчае заданне на 103 проц. Брыгады другой папяровай машыны (сетачнікі тт. Гансеўскі, Шыбнеў і Марозаў) далі звыш квартальнага плана больш 40 тон паперы. Шостая папяровая машына штодзённа выпрацоўвае звыш плана 4 тоны паперы.

Цэлюлозны завод сістэматычна выконвае заданне на 105 проц. Перадавымі на гэтым заводзе з'яўляюцца змены тт. Протчанкі і Махавікова.

Бліскучых поспехаў дабіўся дрэвамасны завод. Квартальны план ён выканаў датэрмінова. Стахановы гэтага завода тт. Журавлёў, Баркоў, Наумаў і Леўкіна выконваюць норму на 140 проц.

Выдатных паказальнікаў дасягнуў спытквы аддзел. У снежні ім выпушчана звыш плана 2.400.827 вучнёўскіх спытквў. Цэх шырспажыву выканаў гадавы план на 161,5 проц.

За праяўленую ініцыятыву, выкананне і перавыкананне плана і перадачу стаханаўскага вопыту работы народны камісар цэлюлознай і папяровай прамысловасці т. Чэбатараў узнагародзіў значком «Отличнику социалистического соревнования Наркомбумпрома» сетачнікаў тт. Ф. А. Шыбнева, Л. Б. Гансеўскага, І. П. Калінаўскага, старшага дэфібрэрыўчыка тав. У. А. Леўкіна, спывальшчыц тт. А. А. Журбенкову і В. Цапюк, начальніка цэлюлознага завода І. К. Баброўніка.

Рады перадавікоў вытворчасці шырэцца. Рабочыя завода з натхненнем змагаюцца за звышпланавыя сотні тон паперы і мільёны вучнёўскіх спытквў.

А. ЛЮТАРЭВІЧ,
Ф. СКОБЛІКАЎ.

Кузьма Чорны

Новагодняя ноч

АПАВЯДАННЕ

У гэты момант усім здалося, што вусы ў дзядзькі Людвіка яшчэ больш, як заўсёды, абвіслі ўніз. «Ён або недапіў, або перапіў»,— падумаў сын. «Зараз нешта прылумае смешнае», — падумала дачка. «Нешта ўспомніў і зараз пачне расказваць», — падумала жонка, якая лепш за ўсіх ведала норавы свайго мужа. А госці —суседзі і сваякі пілі і закусвалі, але сёй-той, гледзячы на свайго гасціннага гаспадара, думаў, што Людвік нечым незадаволен.

Ён нешта раптам змоўк, працерабіў пальцамі вусы, адсунуў ад сябе чарку, але не зусім далёка, так што відно было што ён яе ўсё-ж такі выпе.

— А ведаеце, — роўна дваццаць пяць год таму назад... гэта-ж... У тысяча дзевяцьсот пятнаццатым... ох, як ідуць гады!

І дзядзька Людвік змоўк, засмучоны горкай праўдай, што адзін год вельмі шпарка саступае месца другому.

— Лепш вазьмі ды закусі, — сказала жонка, палсоўваючы яму доўгую талерку, дзе, натапырыўшы вуха, ляжала белае, як парклёвае, парася.

Людвік з пагардай паглядзеў на жонку і рашуча разгроб над ротам вусы. «Хоць каб не сказаў якога глупства»,— пачала баяцца жонка.

— Роўна дваццаць пяць год таму назад, у новагоднюю ноч стаяла хмурнае надвор'е,— моцна вымагаючы да сябе ўвагі, — сказаў Людвік, і ўсе павярнулі да яго твары. — Наш полк у тую ноч, з вечара, заняў новую пазіцыю і меў дробную сутычку з праціўнікам, але вялікіх баёў у тыя дні як раз не было. Умацоўваючыся на новым месцы, мы натыкаліся на трупы варожых салдат. Адзін з гэтых салдат не быў яшчэ трупам, ён толькі паміраў, і я, на нейкім абшарпаным гарматамі хмызнячным узлеску, якраз на яго паткнуўся. Ён ціха стагнаў і нешта ўсё хацеў сказаць. Хоць было і цёмна, але я заўважыў, што ён адной рукой, якая мусіць была ў яго здаровая, стараецца нешта дастаць з свайго ранца. А ранец неяк наспрытна ляжаў у яго пад бокам. Я нагнуўся на момант і ўбачыў, што ён цягне з ранца нешта накшталт пісьма. Я памог яму. Гэта сапраўды было пісьмо. А другое, як я тут-жа заўважыў, толькі краем відно асталося з ранца. Я дастаў і тое. У маіх руках было два пісьмы. Я іх працягнуў ранеламу салдату, каб ён забраў іх, але слабым рухам пальцаў і незразумелым мне шэптам ён даў мне зразумець, каб я забраў іх сабе. Я-ж быў салдат, які бачыў шмат чаго на свеце, і мне стала ясна, што ён просіць, каб я гэтыя пісьмы адаслаў як-небудзь. Я паднёс іх да вачэй і заўважыў, што адрасы напісаны. Салдат гэта бачыў і змоўк. Яму стала спакайней на душы, гэта я ведаў.

Затрымлівацца на тым месцы больш я не мог. Я пайшоў далей ад салдата, ён ужо больш не стагнаў. Пісьмы я схаваў у свой ранец, і ўся тая новагодняя ноч прайшла ў клопаце. Валокся густы золкі туман, мы дзяўблі кіркамі і капалі рыдлёўкамі зямлю. Адным словам сказаць, да раніцы мы ўмацаваліся на новым месцы, але, як выявілася, не надоўга. На світанні зноў была дробная сутычка, і мы апынуліся ў новым месцы. Памятаю, што туман разышоўся, мы беглі пакарпаным снарадамі полем. Я прабег тым самым месцам, дзе хадзіў уночы. Пад самы канец бою мяне ранілі. Калі ўсё спіхла, мяне адправілі ў шпіталь, і я тады мала што памятаў. Памятаю толькі, як праз сон, што мне было вельмі холадна і пад німалі мяне з снегу.

А як мае быць апамятаўся я праз некалькі дзён у шпіталі. Тады я ясна ўспомніў, што калі мы беглі на світанні, то я ўбачыў быў таго самага салдата, у якога ўначы забраў два пісьмы. Ён ужо ляжаў нежывы. У шпіталі я ляжаў каля трох месяцаў. От якая мне была новагодняя ноч дваццаць пяць год таму назад.

Дзядзька Людвік змоўк і пачаў глядзець кудысьці ў сцяну, хмурачы бровы і паторгваючы вусы.

— Ну а пісьмы? — не вытрымаў самы неспакойны з гасцей.

— Ага, пісьмы. Ну што-ж, пасля шпіталя выдалі мне мой ранец, нечапаны, такі самы, як ён быў у мяне, і адправілі зноў на фронт. Аж да самай рэволюцыі я быў у такой абстаноўцы — то бай, то перахопы, то хвароба, то шпіталь — не да тых пісем было. Вядома, я быў гад печаны, што не адаслаў іх як-небудзь адразу, але трэба разумець тое, што я, просты і толькі крыху граматны чалавек, не сядзеў тады так, як цяпер з вамі, за такім сталом, а не спадзяваўся жывым астацца. Гэта праўда, што я не герой там які-небудзь, тут перад вамі я таіцца не буду.

— А ў партызанах-жа супроць палякаў быў, — абазвалася жонка, нездаволеная апошнімі словамі свайго Людвіка.

— Што ў партызанах! Пра гэта тут не ход! Адным словам, сказаць вам, я сам сябе не паважаю за тое, што тады не адаслаў тых пісем. Яны ў мяне, на самым дне ранца, праляжалі аж да самага канца вайны. А як пачалася ўжо рэволюцыя, дык, сказаць вам, думалася — куды цяпер пасылаць тыя пісьмы, не дойдуць яны ўжо нікуды. Я распатрашыў ранец, а пісьмы пакрушыў у руках і так і гэтак. Я і так слаба тады чытаў, а па-чужаземнаму, па-нямецку, ні як там было напісана — па ўсёй акружнасці і чалавека такога ў нас не было, каб хто расчытаў.

Адным словам, сказаць вам, я тыя пісьмы схаваў. Пайшоў год за годам, я часам дастану іх, пагляджу, падумаю, што тут жа-ж чалавек думкі свае ад душы пісаў некаму роднаму! Так падумаю і зноў схаваю. І так усё было аж пакуль ён, — Людвік паказаў на сына, — аж пакуль ён не падрос і не паехаў вучыцца ва універсітэт...

Слухаючы Людвікаў расказ, ніхто не глядзеў на яго сына, студэнта, які канчаў ужо універсітэт. Каб на яго хто раней глянуў, то заўважыў-бы, што ён увесь час неяк дзіўна трымае сябе. У часе бацькавага расказа ён стаў нейкі нецярплівы, занадта рухавы, а часамі ўпадаў у задумёнасць і нават быццам не чуў таго, што гаворыць бацька. Цяпер, бачачы, што пасля апошніх бацькавых слоў усе глянулі на яго, ён успыхнуў нейкім празмерным ажыўленнем, прыўзняўся з свайго месца і зноў шпарка сеў.

— Калі я ўжо на другім курсе быў,— перарваў ён бацькавы словы, — прыязджаю на летнія канікулы, бачу раз увечары бацька зноў круціць у руках тыя пісьмы. А я ўжо тады мог чытаць і па-нямецку і па-французску. Бяру ў бацькі пісьмы, чытаю адрасы, бачу — па адным канверце напісан адрас па-нямецку ў Германію, а на другім па-французску ў Францыю. Дзіўлюся, чаму ў Францыю: я-ж ведаў, што пісьмы былі ў нямецкага салдата. Што-ж, думаю, прайшло многа год— узяў тыя пісьмы, распячатаў і стаў чытаць. Я тады не мог яшчэ бегла чытаць па-французску і па-нямецку, узяў свае студэнцкія слоўнікі і, калі ўсе паснулі, чытаў слова за словам.

— Што-ж было ў тых пісьмах? — абазваўся нецярплівы госць.

— І ў адным пісьме, і ў другім было адно і тое-ж. І французскі салдат, і нямецкі — кожны з іх пісаў сваёй сям'і, дадому, самыя ласкавыя, самыя лепшыя словы ад душы і сэрца. Французскае пісьмо было напісана раненым французскім салдатам, які пакуль яшчэ не аслабеў зусім ад раны, ляжаў у полі і стараўся дапісаць пачатае яшчэ перад боем пісьмо. Канец гэтага пісьма — гэта ўжо было развітанне з сваімі блізкімі.

— А як-жа гэтае пісьмо магло трапіць у рукі нямецкаму салдату? — устрапянуўся нецярплівы госць.

— Я магу ручацца, — сказаў Людвік, —што яно трапіла да нямецкага салдата так, як і ў мае рукі. Немец напэўна быў на французскім фронце і напаткаў раненага француза, можа нават у момант яго смерці.

— Я, — сказаў студэнт, — не вытрымаў, запячатаў пісьмы ў новыя канверты, напісаў тыя самыя адрасы і здаў на пошту. Коратка растлумачыўшы ў запісцы кожнаму адрасату як гэта ўсё было.

— І добра зрабіў, — уздыхнуў Людвік, — хоць сумленне крыху чысцейшае.

— Цяпер слухайце, — сказаў студэнт. Тут напісана па-французску, але я адразу буду вам пераклумачваць на нашу мову.

Студэнт дастаў з кішэні пісьмо, дастаў з канверта ліст і прачытаў:

«Невядомы, далёкі друг! Маё сэрца ўдзячна вам за тое пісьмо, што я атрымала ад вас два годы таму назад. З яго я даведалася аб акалічнасцях смерці майго мужа многа год таму назад. Новыя раны ў маім сэрцы адкрылі і тую старую рану. Калі я пішу вам гэтыя радкі, я аплакваю свайго сына, таго самага любага хлопчыка, з якім у тым пісьме назаўсёды развітваўся мой бедны муж. Мой сын забіт на вайне ў гэтым годзе, і я асталася адна. Вайна выгнала мяне з дому і разбурыла яго. Я стала бяздомная і адзінокая ў сваёй няшчаснай мілай Францыі. Маё сэрца не вытрымала і я пішу вам, няшчасная жонка і маці. Я выказваю вам сваю ўдзячнасць. Я не ведаю хто вы, але ваша сэрца зразумее мяне. Я ведаю пра вас, што вы маеце свой дом і спакой у ім...»

Студэнт дачытаў пісьмо да канца.

Я яго атрымаў пялаўна, — сказаў ён.

Але яго слоў ніхто не чуў. Усе маўчалі і думалі пра тое, што маюць і дом, і спакой, жыццё і шчасце, і радасць, і сваю ясную будучыню.

Была поўнач. Пачынаўся тысяча дзевяцьсот сорак першы год.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 3 студзеня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе, што 2 студзеня германская авіяцыя атакавала розныя аб'екты на ўсходнім узбярэжжы Англіі. Адно вартавое судно затанула. 3 студзеня буйнае злучэнне германскай авіяцыі, адказваючы на бамбардыроўку Брэмена, зрабіла налёт на порт і горад Кардыф. Узнікшыя пажары былі відаць на адлегласці 100 кілометраў.

Англійскія самалёты бамбардыравалі два населеныя пункты ў Паўночнай Германіі. Разбурана некалькі жылых дамоў. Узнікшыя на некаторых складах і ў фабрычных будынках пажары былі ліквідаваны, не нанёсшы страт прамысловым або ваенным аб'ектам. У часе бамбардыроўкі 8 чалавек забіта і 20 ранена. Два англійскія самалёты збіты. Адзін германскі прапаў без весці.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 3 студзеня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора днём германскія самалёты бамбардыравалі адзін з гарадоў графства Кент. Матэрыяльныя страты і лік афяр нязначны. У адным з гарадоў заходняй часткі Англіі забіта некалькі чалавек.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў ноч на 3 студзеня жорсткай бамбардыроўцы падвергся адзін горад у Паўднёвым Уэльсе. Налёты на іншыя часткі Англіі былі нямоцнымі. Колькасць афяр невялікая, страты параўнальна нязначныя. Налёт быў зроблен таксама на Лондан.

Ваенныя дзеянні ў Албаніі

ЛОНДАН, 3 студзеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, на поўнач ад Клісуры грэкі занялі некалькі вёсак. Італьянцы аказваюць упорнае супраціўленне. На паўночным і цэнтральным франтах паміж Маскаполе і Лінам атакі італьянцаў былі ўсюды адбіты. Італьянцы ўзялі было Пішкапал на возеры Охрыда на поўдзень ад Ліна, але хутка былі выбіты адтуль. На поўнач ад Маскаполе, на цэнтральным фронце, італьянцы атакавалі вельмі ўмацаваны грэчаскія пазіцыі на лініі Крушова-Трэсова. Пасля ўпорных баёў грэкам удалося аслабіць напіск італьянцаў шляхам паспяховага манеўра на паўночным флангу. У гэтым сектары грэкі панеслі значныя страты.

НЬЮ-ЙОРК, 3 студзеня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, па непацверджаных вестках, грэкі ўстанавілі артылерыю на гары Мурыкані ў 5 мілях на паўднёвы ўсход ад Эльбасана і пачалі абстрэл горада.

У прыбярэжным сектары італьянцы пацярпелі паражэнне ў 8 мілях на поўнач ад Хімары, страціўшы каля 200 чалавек забітымі і раненымі. Больш 450 італьянцаў узята ў палон. Італьянскія войскі адступаюць уздоўж прыбярэжнай дарогі па напрамку да Валоны. Грэкі праследуюць іх праз горы Кераўніа. Грэчаскія войскі, наступаючыя ў раёне Клісуры, занялі новыя пункты. Захвачана 2 пяжкія гарматы і многа ваенных матэрыялаў.

У гутарцы з карэспандэнтам агенцтва Асошыэйтэд Прэс, які знаходзіцца ў паўднёвай частцы Албаніі, амерыканскі ваенны назіральнік маёр Кроу сказаў, што грэкі трымаюць у сваіх руках ініцыятыву на ўсім паўднёвым фронце, але адчуваюць патрэбу ў самалётах, грузавіках і мулах.

Зводка італьянскага камандавання

РЫМ, 3 студзеня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе, што ля граніцы Кірэнаікі італьянская артылерыя абстрэляла механізаваныя часці і ваенныя караблі праціўніка. Італьянская авіяцыя бамбардыравала адну з перадавых баз праціўніка і стаяўшыя ля ўзбярэжжа англійскія караблі. Іншыя самалёты бамбардыравалі і абстрэлялі з кулямётаў англійскія механізаваныя часці на фронце Бардыі і ў пустыні. Усе італьянскія самалёты вярнуліся.

На грэчаскім фронце адбіты непрыяцельскія атакі мясцовага характару. Італьянскія войскі прадпрынялі контратаку, прымусіўшы ўцякаць войскі праціўніка і захваціўшы палонных. Самалёты праціўніка бамбардыравалі Эльбасан. Ёсць афіары сярод насельніцтва.

Падрабязнасці налёту на Брэмен

ЛОНДАН, 3 студзеня. (ТАСС). Міністэрства інфармацыі перадае, што пры налёце англійскіх бамбардыроўшчыкаў на Брэмен у ноч на 2 студзеня асноўным аб'ектам бамбардыроўкі былі вялікія верфі, на якіх будуюцца ваенныя караблі і галоўным чынам падводныя лодкі. Апрача таго, бамбардыроўцы падвергліся нафтасховішчы, чыгуначныя лініі і авіяцыйны завод Фокке-Вульф. На верфях узнік вялікі пажар, а па заводзе, апрача таго, адбылося 6 узрываў. Нафтасховішчы, чыгуначныя лініі і розныя прамысловыя прадпрыемствы моцна пашкоджаны.

Бамбардыроўка Салонік

САФІЯ, 3 студзеня. (ТАСС). Рымскі карэспандэнт газеты «Зара» паведамляе, што ўчора італьянская авіяцыя прадпрыняла жорсткую бамбардыроўку Салонік. Было скінута многа бомб на прамысловыя прадпрыемствы і іншыя аб'екты. Карэспандэнт падкрэслівае, што з прыбыццём у Італію германскага паветранага корпуса ў бліжэйшыя дні чакаецца рэзкае ўзмацненне дзеянняў авіяцыі супроць Грэцыі.

Арышт Калам Азада

ЛОНДАН, 3 студзеня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр з Алахабада (Індыя), арыштаван на аснове закона «Аб абароне Індыі» старшыня індыйскага нацыянальнага кангрэса Калам Азад.

Прамова Чан Кай-шы

ЧУНЦЫН, 2 студзеня. (ТАСС). У прамове па радыё, прысвечанай новаму году і 30-годдзю Кітайскай рэспублікі, Чан Кай-шы сказаў, што Кітайская рэспубліка ў 31 год свайго існавання павінна з новымі намаганнямі прадаўжаць супраціўленне і будаўніцтва Вынікі ваенных аперацый, сказаў Чан Кай-шы, паказваюць несумненны правал планаў ворага. Міжнароднае становішча бесперапынна паляпшаецца ў карысць Кітая. Аднак народ павінен быць пазнаёмлен, што хоць правал ворага ў гэтай вайне і прадбачаны, але трэба многае яшчэ зрабіць, каб забяспечыць перамогу. Барацьба па франтах і ўнутранае будаўніцтва неадрыўлімы адно ад другога.

Важнейшым пытаннем, заявіў далей Чан Кай-шы, астаецца пытанне аб эканоміцы нацыянальнай абароны. У агні вайны павінен быць дан штуршок ла стварання эканамічнай базы і забяспячэння ваеннай гатоўнасці. Канечнай мэтай з'яўляецца правядзенне ў жыццё трох прынцыпаў Сун Ят-сена і ўвядзенне канстытуцыі. Умовы вайны, падкрэслівае Чан Кай-шы, ствараюць магчымасць больш лёгкага ажыццяўлення гэтых задач. Гэтаму садзейнічаюць два важныя фактары ваеннага часу—самаафяраванне і строгая дысцыпліна.

Супраціўленне, сказаў у заключэнне Чан Кай-шы, павінна праводзіцца і далей, не гледзячы ні на якія афіары, да таго часу, пакуль не будзе заваявана вызваленне Кітая, пакуль унутранае будаўніцтва не забяспечыць пастаянную ваенную гатоўнасць краіны. Таму, заявіў Чан Кай-шы, трэба ўсвядоміць усю важнасць будаўніцтва, побач з вядзеннем вайны, каб давесці нашу магутнасць да такога ўзроўню, які гарантаваў-бы нам перамогу.

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

У замежным друку распаўсюджваецца паведамленне аб тым, што 1 студзеня ў газеце «Правда» або ў нейкай іншай савецкай газеце нібы быў апублікаван не то артыкул, не то новатодні зварот тав. Сталіна з аналізам міжнароднага становішча.

ТАСС упаўнаважан абвергнуць гэтае паведамленне, як выдуманае.

ДАКЛАД ВЯРХОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ ГЕРМАНСКАЙ АРМІІ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ У ДРУГОЙ ПАЛАВІНЕ 1940 г.

БЕРЛІН, 3 студзеня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае даклад вярхоўнага камандавання германскай арміі аб ваенных дзеяннях у другой палавіне 1940 года. У дакладзе гаворыцца, што з часу ўстанаўлення перамір'я з Францыяй пачаліся падрыхтаванні да барацьбы супроць Англіі. Пасля правядзення работы па ачышчанню і ахове велізарнай паласы прыбярэжных вод ад Нордкапа і да іспанскай граніцы лёгкія германскія ваенна-марскія сілы ўступілі неадкладна ў бой. Асабліва паспяховым было ўвядзенне ў дзеянне ваенна-марскіх сіл у акіянскіх водах. На працягу другой палавіны 1940 года германскім ваенна-марскім флотам было патоплена 12 эсмінцаў, 8 падводных лодак, 9 дапаможных крэйсераў, 3 канаэрскі і 63 дробныя караблі. Авіяцыяй у гэты-ж час было патоплена 32 ваенныя караблі. Агульнае водазмяшчэнне англійскіх ваенных караблёў, патопленых за другую палавіну 1940 года, складае 190 тыс. тон. Страты англійскага гандлёвага флота ў выніку дзеянняў германскіх ваенна-марскіх сіл склалі 3.200 тыс. рэгістравых брута-тон і ў выніку дзеянняў германскай авіяцыі—звыш 700 тыс. рэгістравых брута-тон.

Акрамя таго, атрымалі пашкоджанні не менш 264 гандлёвых суднаў праціўніка, агульным таназжам звыш 2 млн. рэгістравых брута-тон.

З 25 чэрвеня мінулага года германскія страты склалі: 3 мінаносцы, 5 мінных траўлічыкаў, 8 падводных лодак і 12 дробных суднаў.

З 24 кастрычніка ў налётах на Англію пачалі прымаць удзел і атрады італьянскай авіяцыі. З 8 жніўня германская авіяцыя скінула ў часе двух тысяч налётаў на Англію звыш 43 млн. кгр. фугасных і звыш 1.600 тыс. кгр. запальваючых бомб. Праціўнік за гэты час скінуў бомб у 25 разоў менш гэтай колькасці. Страты, нанесеныя германскім ваенным і ваенна-гаспадарчым аб'ектам, нязначныя.

ДАЛЕЙШЫЯ ПЛАНЫ АКАЗАННЯ АМЕРЫКАНСКАЙ ДАПАМОГІ АНГЛІІ

НЬЮ-ЙОРК, 3 студзеня. (ТАСС). Паводле паведамлення лондонскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у добра інфармаваных кругах заяўляюць, што Англія лабіраецца атрымання яшчэ некаторай колькасці амерыканскіх эсмінцаў для канваіравання сваіх гандлёвых суднаў, а таксама для аперацый супроць падводных лодак у Атлантычным акіяне. У гэтых кругах, прадаўжае агенцтва, указваюць, што ў хуткім часе пасля прыезду ў Вашынгтон новы англійскі пасол Галіфакс узніме пытанне аб набыцці Англіяй амерыканскіх падводных лодак і гандлёвых суднаў. Таксама ўлічваюць нядаўнюю заяву лорда Вултона аб тым, што Германія пагражае падарваць снабжэнне Англіі харчаваннем. За 16 месяцаў вайны патоплены англійскія, саюзныя і нейтральныя судны агульным водазмяшчэннем прыкладна ў 4,5 млн. тон, у той час, як за ўвесь перыяд вайны 1914—18 гг. страты англійскага гандлёвага флота склалі 7.759 тыс. тон.

Па наяўных вестках, за апошні год у англійскіх і амерыканскіх кругах абмяркоўвалася пытанне аб магчымасці заключэння такога пагаднення, па якому амерыканскія параходы замяніла-б англійскія судны на паўднёва-амерыканскіх і далёкаўсходніх гандлёвых лініях. Гэта аслабаніла-б англійскія параходы для скарыстання іх на трансатлантычных гандлёвых лініях. Аднак, піша ў заключэнне карэспандэнт, англічане апасаліся, што такое пагадненне можа прывесці да захвату амерыканскімі параходнымі кампаніямі пасля сканчэння вайны тых гандлёвых ліній, якія зараз абслугоўваюцца англійскімі параходамі.

Кіно

„СІБІРАКІ"

Выхаванне ў совецкіх дзецях гарачай любві да сваёй маці-радзімы, высокіх якасцей, уласцівых совецкаму чалавеку, грамадзяніну новага свету—важнейшая задача нашага мастацтва.

Аўтары фільма «Сібіракі» (сцэнарый А. Вітэнзона, ражысёр заслужаны дзеяч мастацтваў Л. Куляшоў) расказваюць простую і чуллівую гісторыю маленькіх сібіракоў-піянераў, аб іх мужных паводзінах, аб іх чыстых пачуццях любві і ўдзячнасці вялікаму Сталіну.

Стары паляўнічы Дашындон расказвае выдатнікам вучобы Сяружы і Пеці легенду аб трубцы, якую Сталін падарыў паляўнічаму за тое, што той дапамог яму ўцячы з ссылкі. Было б вельмі добра, гаворыць Дашындон, калі-б гэтая трубка была знойдзена і вернута Сталіну. Старая пагаворка кажа: «Трубку друга курыць будзеш—друга ўспомніш».

Сяружа і Пеця загараюцца жаданнем ва што-б та ні стала знайсці трубку. Яны зробяць усё для таго, каб яе знайсці. Іх нішто не спыніць на гэтым шляху. Нахай будуць якія хочаш пяжкасці, няхай будуць самыя вялікія перашкоды,—трубка будзе знойдзена! Яны самі паязджаць яе ў Маскву. Прыдуць да Сталіна і скажуць: вось Ваша трубка, таварыш Сталін, яе знайшлі піонеры з Новай Уды. І Сталін закурыць сваю трубку і ўспомніць сваё гераічнае юнацтва, годы ссылкі, лішэнняў і барацьбы.

Дзеці клянуцца ў тым, што яны нікому не выдадуць сваёй тайны. Ніхто не павінен ведаць аб іх планах.

Піонеры задумваюцца пад пытаннем: хто-ж падарыў Сталіну трубку? І прыходзяць да высновы, што трубку Сталіну падарыў Ленін. Значыць, гэта вельмі каштоўная рэч і Сталін будзе вельмі рад, калі атрымае яе.

Дзеці ўсім сэрцам, усёй душой аддаюцца ажыццяўленню сваёй задачы. Іх натхняе найвялікшае пачуццё любві да таварыша Сталіна, жаданне зрабіць яму прыемнае. Яны даведваюцца, што ў паляўнічага Аляксея ёсць трубка, па прыметах падобная на трубку Сталіна. Як-жа атрымаць яе? Аляксей пайшоў у тайгу на паляванне разам з сваёй пляменніцай Валяй. Трэба пайсці ў тайгу, знайсці Аляксея і патрасіць у яго трубку. Яны пайшлі. Іх не страшаць непраходныя балоты, драпежнікі, цемра ночы—нішто! У іх ёсць мэта—яны павінны яе ажыццявіць, нават калі гэта будзе ім каштаваць жыцця.

Трубка аказалася ў Сяружы і Пеці.

Лепшых выдатнікаў вучобы пазываюць у Маскву на экскурсію. Сяружа і Пеця таксама едуць. Яны вязуць трубку таварышу Сталіну.

Многа сапраўднай рамантыкі ў гэтым фільме. Ён прасякнут узвышанай прастатой. У ім—правільнае адчуванне жыцця дзяцей.

Самае, бадай, выдатнае ў фільме—гэта сон піонеркі Валі. Лепшая выдатніца, яна «зрэзалася» на экзаменах па матэматыцы. Яна гэта зрабіла наўмысла, каб Сяружа змог паехаць у Маскву. Яна ведала тайну рэбят. І калі-б яна здала матэматыку на выдатна—Сяружы прыйшлося-б астацца дома. Хто-ж тады павязе трубку таварышу Сталіну.

І вось сніцца цудоўны сон Вале. Сяружа і Пеця падыходзяць да варот Кремля.

— Вам куды?—пытае міліцыянер.

— Мы да таварыша Сталіна. У нас пісьмо да яго ёсць.

— А вы не з Новай Уды?

— Так, з Новай Уды.

— Калі ласка, праходзьце. Таварыш Сталін вас чакае.

Заходзяць яны ў кабінет да таварыша Сталіна, перадаюць яму трубку і пісьмо. Расказваюць аб учынку Валі.—Малайцы, рэбяты,—гаворыць Сталін. А Валя паступіла няправільна. А між іншым спытаем у самой Валі. Вось я яе паклічу.

Заходзіць Валя, узбуджаная... Сталін бярэ трубку, закурвае... Хоць гэта не тая трубка, але нічога... Трубку другі курыць будзеш — друга ўспомніш, — гаворыць Сталін...

Валя прачынаецца,—як шкада,— гаворыць яна,—што гэта быў толькі сон. Але Аляксей чытае пісьмо з Масквы, у якім настаўніца піша, што Сяружа і Пеця паслалі пісьмо і трубку таварышу Сталіну і што яе, Валю, запрашаюць у Маскву...

У карціне многа бліскучых кадраў, многа ражысёрскай выдумкі. Гэты фільм яшчэ раз сведчыць аб майстэрстве Л. Куляшова, аднако з ражысёраў-зачынальнікаў совецкага кіно. Апошнія пяць год Л. Куляшоў маўчаў. Ён не паставіў за гэты час ні аднаго фільма. І новая ўдача ражысёра радуе ўсіх тых, хто любіць наша кіномастацтва.

Ролю І. Сталіна выдатна выконвае артыст М. Геловані. Паляўнічага Дашындона добра іграе артыст Д. Орлоў.

Нашы юныя ды і дарослыя грамадзяне з вялікім задавальненнем будуць глядзець фільм «Сібіракі».

С. КУНЯЎСКІ.

10-годдзе педагагічнага інстытута імені С. М. Кірава

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону) Адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 10-годдзю педагагічнага інстытута імені С. М. Кірава. Памяшканне Беларускага дзяржаўнага тэатра запоўнілі студэнты, прафесары, навуковыя работнікі, выкладчыкі інстытутаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горада і шматлікія госці.

У прэзідыуме — лепшыя людзі інстытута — старэйшы прафесар Л. Н. Нікапаў, кандыдат фізічных навук тав. Горскі, кандыдат філасофскіх навук тав. Азлуні, сталінскія стыпендыяты тт. Сакалоў, Вароніна, Іваноў, прадстаўнікі Наркомасветы БССР, партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый горада.

Сход адкрыў дырэктар інстытута тав. Каляда.

Пад бурную авацыю прысутныя выбіраюць у пачотны прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб дзесяцігоддзі інстытута выступіў тав. Горскі. Затым былі зачытаны шматлікія прывітанні юбіляру, а таксама загад народнага камісара асветы БССР тав. Уралавай аб прэміраванні старэйшых работнікаў інстытута.

З вялікім уздымам удзельнікі схода прынялі тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

***

ВІЦЕБСК. Вышлі з друку навуковыя запіскі факультэта прыродазнаўства Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імені С. М. Кірава.

Апублікавана 10 навуковых работ, у тым ліку артыкул удзельніка Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года— выкладчыка А. І. Радкевіча на тэму «Натуральнае шоўкапрадства ў БССР», артыкул кандыдата прыродазнаўчых навук О. Д. Акімава «Да флоры азёр Беларусі» і інш.

Аб'ём зборніка—5 друкаваных аркушаў. (БЕЛТА).

Усесаюзны перапіс жывёлы

1 студзеня, у 8 гадзін раніцы, ва ўсіх сельскіх і гарадскіх мясцовасцях нашай рэспублікі больш 7 тысяч шчотчыкаў выйшлі праводзіць усесаюзны перапіс жывёлы і птушкі. Абход участкаў усе шчотчыкі робяць сумесна з брыгадамі садзейнічання перапісу, у якія ўваходзяць дэпутаты і актывісты мясцовых советаў.

Усесаюзны перапіс жывёлы закончыцца 8 студзеня.

На лыжах за матацыклам

У абласных аўтамотаклубах ідзе падрыхтоўка да матацыклетных спаборніцтваў з лыжнікамі па буксіры.

Цікавае мерапрыемства намечана правесці ў чэсць XXIII гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Адбудзецца ўсебеларуская ваенізіраваная матацыклетная звёздная эстафета. З усіх усходніх і заходніх абласцей рэспублікі да фініша ў сталіцу БССР накіруюцца матацыклетныя каманды. За кожным матацыклам будзе следаваць на буксіры лыжнік. У Мінск каманды прывязуць рапарты аб стане абаронна-фізкультурнай работы ў абласці.

Прачытайце гэтыя кнігі

У кніжныя магазіны Мінска паступілі новыя кнігі аб фізкультуры і спорце. Сярод іх: вучэбны дапаможнік па валейболу для спартыўнай секцыі, у распрацоўцы якога прымалі ўдзел майстры валейбола В. А. Асколкава і А. А. Сцяпанаў; «Анатомія чалавека»—доктара медыцынскіх навук прафесара М. Ф. Іваніцкага; «Як арганізаваць лыжную базу», «Як самому рабіць лыжы» і «Вучыся хадзіць на лыжах»—заслужанага майстра спорта В. Серабракова; «Лыжны баец»—палкоўніка А. В. Гаўрычкова; брашуры па рукапашнаму бою і фехтаванню, па плаванню, грэблі, вольнай барацьбе, боксу, тэнісу і т. д.

Сход дапрызыўнікаў горада Мінска

Учора ў клубе імені Сталіна адбыўся агульны сход дапрызыўнікаў сталіцы БССР. Пад бурныя апладысменты ў пачотны прэзідыум былі выбраны члены Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з любімым правадыром народаў таварышам Сталіным.

З дакладам аб задачах падрыхтоўкі да чарговага прызыву ў РСЧА выступіў тав. Арэф'еў. Выступаўшыя дапрызыўнікі тт. Рымашэўскі, Пятроўскі, Рабіновіч і інш. заявілі, што маладыя совецкія патрыёты па выдатна падрыхтуюць сябе, каб стаць дастойнымі воінамі вялікай краіны сацыялізма.

Дапрызыўнікі расказалі аб сваёй вытворчай рабоце на прадпрыемствах, а таксама аб тым, як яны авалодваюць ваеннымі ведамі.

На сходзе выступіў намеснік загадчыка ваенным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Ключынскі.

З велізарным натхненнем, пад доўга незмаўкаючыя апладысменты ўдзельнікі схода прынялі прывітанні вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну і Наркому Абароны СССР Герою і маршалу Совецкага Саюза тав. Тімашэнка.

Дапрызыўнікі Мінска прынялі зварот да ўсіх дапрызыўнікаў БССР, у якім яны заклікаюць іх узорна рыхтавацца да ўступлення ў рады РСЧА і актыўна ўключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва ў чэсць XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

У заключэнне для дапрызыўнікаў быў дан вялікі канцэрт.

„Платон Крэчэт" на чырвонаармейскай сцэне

Днямі ў клубе Н-скай часці Заходняй Асобай Ваеннай Акругі адбылася прэм'ера спектакля «Платон Крэчэт» А. Карнейчука ў выкананні чырвонаармейскага драматычнага гуртка. Галоўную ролю — Платона Крэчэта выконвае малодшы камандзір т. Рассолаў, ролю Ліды — жонкі камандзіра т. Харытановіч, Берэста — курсант т. Торба, старога ўрача Бубліка — чырвонаармеец т. Баранаў.

Паставіў спектакль малодшы камандзір т. Рассолаў. Мастацкае афармленне ажыццявіў мастак-самавучка, малодшы камандзір т. Баляба, музыкальнае афармленне—чырвонаармеец т. Трыпупін.

Зал клуба быў перапоўнен байцамі, камандзірамі, палітработнікамі і членамі іх сем'яў. Прысутныя вельмі цёпла сустрэлі спектакль і горача апладыравалі выканаўцам.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

5 студзеня, у 8 гадзін вечара, у клубе імені Сталіна (Інтэрнацыянальная, 17-19) Варашылаўскі РК КП(б)Б праводзіць публічную платную лекцыю аб міжнародным становішчы.

Лектар—дацэнт Ленінградскага педінстытута імені Пакроўскага тав. Ефімаў.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

4 студзеня ПІКАВАЯ ДАМА 5/I—Чыо-Чыо-Сан Пачатак у 8.30 веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

4 і 5 студзеня ПАДЗЬ СЯРЭБРАНАЯ Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

4, 5 і 6 студзеня Прэмтера. ДОС КЛЕЙНЕ МЕНШЭЛЕ Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Кінатэатр «Чырвоная зорка» СІБІРАКІ

Кінатэатр «Радзіма» ЯКАЎ СВЕРДЛОЎ

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» АСАЛЬ

Кінатэатр «Спартак» СТО МУЖЧЫН І АДНА ДЗЯЎЧЫНА

Дзіцячы кінатэатр СІБІРАКІ

Кінатэатр «Навіны дня»

1. Хакасія (кінанарыс).
2. Саюзкінажурналы №№ 110 і 111.
3. Журнал «Совецкая Беларусь» № 70.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з двух пакояў 38 кв. м. з усімі выгодамі на кватэру з трох пакояў большай плошчы. Даведацца з 6—8 г. вечара: Лежінская, 3, кв. 5, Фінкельштэйн.

МІНГАРТОП

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ УСТАНОЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ гор. Мінска,

што на падставе рашэння выканкома Мінгорсовета ад 31 снежня 1940 г. за № 37

УСЕ НАРАДЫ, ВЫДАНЫЯ Ў 1940 ГОДЗЕ НА ДРОВЫ, ТОРФ І БЕНЗІН І НЕРЭАЛІЗАВАНЫЯ,

падлягаюць абмену на нарады 1941 года

ПА СТАРЫХ НАРАДАХ ВОД ПУСК ПРАДУКЦЫІ ПРАВОДЗІЦЦА НЕ БУДЗЕ.

МІНГАРТОП.

Белкантора „ГЛАВВТОРЧЕРМЕТ"

даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых устаноў, прадпрыемстваў і прыватных асоб, што на падставе распараджэння «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТА»

ВІЦЕБСКАЕ І ГОМЕЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕННІ БЕЛКАНТОРЫ «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТ»

3 1 студзеня 1941 года

ЛІКВІДУЮЦЦА

Прэтэнзіі да ўказаных аддзяленняў павінны быць прад'яўлены да 15 студзеня 1941 года ліквідацыйным камісіям гэтых аддзяленняў. Пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Функцыі ўказаных аддзяленняў поўнасцю пераходзяць да Белканторы «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТ».

Разліковы рахунак № 17200 4 у Мінскім аддзяленні Дзяржбанка.

БЕЛКАНТОРА «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТ».

ДА ВЕДАМА УЛАДАЛЬНІКАЎ РАДЫЁПРЫЁМНІКАЎ

РАДЫЁКАМІТЭТ пры СНК БССР паведамляе, што тэрмін узносу абанементнай платы



ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ 1941 ГОДА СКОНЧЫЎСЯ 1 студзеня 1941 года.

Пасля ўказанага тэрміну спаганяецца пеня ў размеры 1 руб. за кожны месяц пратэрміноўкі.

АРГАНІЗАЦЫІ, УСТАНОВЫ, ПРАДПРЫЕМСТВЫ І ПРЫВАТНЫЯ АСОБЫ!

НЕ ЧАКАЙЦЕ ПРЫХОДУ НА ДОМ КАНТРАЛЁРАЎ АБО ПІСЬМОВЫХ НАПАМІНКАЎ радыёкамітэта, а СВОЕЧАСОВА РЭГІСТРЫРУЙЦЕ СВАЕ РАДЫЁПРЫЁМНІКІ І ЎНАСІЦЕ АБАНЕМЕНТНУЮ ПЛАТУ.

Рэгістрацыю праводзяць радыёвузлы, паштовыя канторы і іх агенцтвы.

АСОБЫ, У ЯКІХ БУДУЦЬ ВЫКРЫТЫ незарэгістрыраваныя радыёпрыёмнікі, БУДУЦЬ АШТРАФАВАНЫ згодна пастановы СНК СССР ад 29/IX 1939 года № 1593.

РАДЫЁКАМІТЭТ ПРЫ СНК БССР.

На падставе пастановы прэзідыума Мінгорсовета ад 10/V—1939 г. за № 12/2

УСТАНОВЫ, ПРАДПРЫЕМСТВЫ, АРГАНІЗАЦЫІ І ПРЫВАТНЫЯ АСОБЫ,

ЯКІЯ ЗАЙМАЮЦЬ ЗЯМЕЛЬНЫМ УЧАСТКІ

на гор. Мінску ПАД БАЗЫ, СКЛАДЫ, ГАРАЖЫ, КОННЫЯ ПАРКІ, ЛАРКІ, ПАЛАТКІ, ПЯЛЕЖКІ і інш.

АБАВЯЗАНЫ з 1 студзеня па 1 лютага 1941 г.

ЗАКЛЮЧЫЦЬ І ПЕРАЗАКЛЮЧЫЦЬ З АРЭНДНАЙ ГРУПАЙ

МІНГОРКОМГАСА ДАГАВОРЫ на арэнду гэтых участкаў на 1941 год.

АДРАС: пл. Свабоды, 2. Арэндная група Мінгоркомгаса.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР ПЕРАМЯСЦІЛАСЯ

ў Доме ўрада з пакоя № 307 у пакой № 45 (цокальны паверх); тэлефоны: 22-060 і № 244 (камутатар Дома Ўрада).

Патрабуюцца

ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ, СТАРШЫЯ БУХГАЛТАРЫ (на самастойным балансе) і БУХГАЛТАРЫ для работы ў гарадах і іншых месцах заходніх абласцей БССР.

Даведацца: Мінск, Энгельса, 32. (ва двары).

БЕЛБРОДТРЭСТУ

патрабуюцца

СТАРШЫ БУХГАЛТАР і БУХГАЛТАР РЭВІЗОР.

Звяртацца: Няміга, 11.

Акадэміі навук БССР

ПАТРАБУЮЦЦА:

ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫ ТОКАР-МЕХАНІК, ТЭХНІК-БУДАЎНІК, кваліфікаваная МАШЫНІСТКА, СТАРШАЯ ТЭЛЕФАНІСТКА і ТЭЛЕФАНІСТКІ.

Звяртацца: вул. Пушкіна, 56, пакой 214, аддзел кадраў.

ТРЭСТУ «БЕЛКРУХМАЛ» (пл. Свабоды, 21/1)

патрабуюцца

для работы на крухмальных заводах у заходніх і ўсходніх абласцях БССР

ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ.

Кватэра прадастаўляецца.

Звяртацца да галоўнага бухгалтара трэста.

У АДДЗЕЛ АБ'яЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛ. 21-399

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДЫ»

патрабуюцца

КАЧАГАРЫ і ПРЫБІРАЛЬНІЧЫЦЫ.

Звяртацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой 4.

1-я МЕХАНІЧНАЯ ПЯКАРНЯ

ПРЫМАЕ НА РАБОТУ

НЕКВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ.

Звяртацца: Старажоўская, 45, аддзел кадраў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20-000 (камутатар) дадатковы — 102 прыёмная рэдактара — 2-13-52 Намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88 Адказнага сакратара — 2-13-53 Намеснік адказнага сакратара — 2-24-12 Сакратарыята — 2-39-55 Аддзелаў: заг партыйнага аддзела — 2-14-46 Літработнікаў — 2-13-56 Заг аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89 Заг эканамічнага аддзела — 2-08-30 Літработнікаў — 2-15-56 Літработнікаў па літаратуры і мастацтву школах ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-18-85 Унутранай інфармацыі — 2-13-60 Аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-08-44 і 2-18-45 Заг выдавецтва — 2-13-58 Бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-99 Выпускаючага — 2-47-68 Карэктарскай—2-13-57

У1053 Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.